# РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА

№ 9 ВЕРАСЕНЬ 1963



Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА

№ 9

ВЕРАСЕНЬ 1963

ВЫДАННЕ ЦК КП БЕЛАРУСІ

ГОД ВЫДАННЯ ТРЫЦЦАЦЬ ДЗЕВЯТЫ

На Сусветным кангрэсе жанчын у Маскве прагучаў моцны голас прадстаўніц розных краін, розных кантынентаў у абарону міру. Вялікае слова «мір» аб'ядноўвала дэлегатак. «Мір неабходны нам,— усхвалявана гаварылі яны,— як паветра, з мірам звязваем мы самае дарагое, самае запаветнае. Без міру няма свабоды, няма прагрэсу і шчасця людзей».

Свабода і шчасце. Колькі мільёнаў людзей нашай планеты мараць аб гэтым!

Мімаволі ўсплывае ў памяці размова на кангрэсе з маладзенькай дзяўчынай Айрас. Яна выказала спадзяванні народаў Афрыкі. Ёй вельмі хочацца, гаварыла яна, каб кожная краіна атрымала свабоду і незалежнасць, мела свой герб, каб кожны народ спяваў свой гімн і апранаўся ў сваё нацыянальнае адзенне.

Гэтага жадае не толькі Айрас. Атрымаць свабоду, дабіцца незалежнасці сваіх краін, пакласці канец жабрацтву і галечы мараць мільёны людзей Афрыкі, Азіі, Паўднёвай Амерыкі.

У сваіх палымяных прамовах жанчыны прыводзілі жахлівыя факты, якія выкрываюць каланізатараў як небяспечных імперыялістычных драпежнікаў. Толькі дзесяць працэнтаў хлопчыкаў Чорнай Афрыкі і не больш пяці працэнтаў дзяўчынак вучацца ў школе. У Судане толькі дзесяць сярэдніх школ, у якіх займаецца па адной-дзве дзяўчынкі. Астатнія пазбаўлены магчымасці вучыцца, набыць прафесію, атрымаць працу.

## МІР, СВАБОДА, ШЧАСЦЕ ЛЮДЗЕЙ

Сэрца сціскалася ад болю, калі мы слухалі расказ прадстаўніцы Парагвая. У яе краіне цяжкае эканамічнае становішча прымушае адных жабраваць, другіх — капацца ў сметніках, шукаючы ежы. Многія маці, ідучы на працу, прывязваюць дзяцей сабе за спіной. Жанчын пазбаўляюць права на працу. А калі яна знойдзе працу, то атрымае толькі палавіну зарплаты мужчыны. Яшчэ горш жывецца сялянкам: у Парагваі прыпадае толькі па аднаму гектару зямлі на хлебароба. Сярэдняя працягласць жыцця ў гэтай краіне не перавышае 28 год. Працоўныя жанчыны пачынаюць разумець, што адваяваць свае правы можна толькі ў жорсткай барацьбе. Прадстаўніца Парагвая расказвала, як жанчыны захапілі фабрыку і ўступілі ў барацьбу з паліцыяй. У яе прамове гучала ўпэўненасць, што народ пераможа ў барацьбе супраць прыгнятальнікаў. «Мы ведаем,— гаварыла яна,— што ёсць сілы, здольныя захаваць мір, што барацьба за мірнае суіснаванне з'яўляецца барацьбой справядлівай. і гэта нас натхняе».

Мільёны жанчын свету мараць атрымаць работу. Але ці магчыма яе знайсці ў такой краіне, як Уругвай, дзе палавіна рабочых — беспрацоўныя? 75 працэнтаў дзяцей тут не ведаюць смаку малака. Палавіна дзяцей у гарадах і 80 працэнтаў у вёсках пакідаюць школы, з другога класа яны шукаюць, дзе б зарабіць на кавалак хлеба. Працоўныя Уругвая змагаюцца супраць галечы, супраць эксплуататацыі, супраць амерыканскіх падводных лодак і вераць у перамогу.

Не лепшае становішча працоўных Эквадора. 47 працэнтаў



✻

Сусветны кангрэс жанчын. Дэлегаткі абменьваюцца адрасамі. Дружба паміж жанчынамі будзе расці і мацнець.

Фота Д. Чарнова.

✻



Удзельніца кангрэсу славутая тэкстыльшчыца Валянціна Гаганава са сваім сынам Сярожам.

іх не ўмее чытаць і пісаць. Тут бываюць выпадкі, калі гаспадары прадаюць зямлю разам з людзьмі.

Доўгі, цяжкі і малааплачваемы працоўны дзень і ў жанчын Іярданіі. Замужніх жанчын звальняюць з работы. А тым, хто працуе, забаронена стаць членамі прафсаюза. Многа жанчын памірае пры родах, бо не мае медыцынскай дапамогі. На тэрыторыі Іярданіі размешчаны амерыканскія ваенныя базы. Патрыётаў краіны кідаюць у турмы.

На тэрыторыі Паўднёвай Афрыкі існуе ганебны закон прапускаў. Тут людзі могуць хадзіць па сваёй зямлі толькі маючы на гэта дазвол. Тым, хто парушыць паліцэйскі рэжым, пагражае смяротная кара. Пад гарачымі сонечнымі праменнямі афрыканцы ад цямна да цямна гнуць спіны на эксплуататараў. Прадстаўніца Паўднёвай Афрыкі заканчвае сваю прамову палымянымі словамі: «Калі б з вуснаў жанчын усёй зямлі адначасова вырваўся стогн абурэння, то ад іх крыку горы ссунуліся б з месца».

Ма Тхі Чу з Паўднёвага В'етнама ўсхвалявана гаварыла, што яна ўвесь час чуе галасы дзяцей, якія даносяцца з турмаў: «Мама, ратуй мяне!» Некалькі год гэта жанчына разам з маленькай дачкой правяла ў турме, і яе па-зверску катавалі на вачах у дзяўчынкі. У Паўднёвым В'етнаме за калючы дрот кінуты мільёны людзей. Супраць народа, які змагаецца за свабоду, амерыканскія ваякі прымяняюць хімічныя сродкі. У выніку насельніцтва астаецца без харчавання, гіне скаціна, атручваюцца вадаёмы, цэлы людзей пакрываюцца апёкамі. Так помсцяць амерыканцы паўднёвав'етнамскаму народу за яго імкненне да вызвалення. Ад імя дзяцей, якія яшчэ не ведаюць слова «бацька», Ма Тхі Чу заклікае жанчын свету ўзняць голас супраць катаў, адвесці іх крывавую руку ад жанчын і дзяцей Паўднёвага В'етнама, Паўднёвай Карэі, Ірака і іншых краін.

Многа жанчын Пуэрта-Рыка кінуты ў турмы толькі за тое, што яны любяць сваю радзіму і змагаюцца супраць амерыканскіх ваенных баз, накіраваных на Кубу, абараняюць жыццё сваіх дзяцей.

Жанчыны капіталістычных і залежных краін добра ведаюць, што такое галеча, беспрацоўе, нераўнапраўе. Асабісты лёс кожнай жанчыны непарыўна звязаны з лёсам яе народа. Тысячы смелых патрыётак ахвяравалі сваім жыццём у барацьбе за агульнае шчасце, тысячы іх пакутуюць у турэмных засценках.

Усё больш і больш разумеюць жанчыны свету, што набалелыя праблемы можна было б вырашыць пры ўмове правільнага скарыстання велізарных магчымасцей, якія адкрывае перад чалавецтвам навука. Але яны бачаць, што выдатныя адкрыцці вучоных служаць вайне і смерці. Жанчыны патрабуюць, каб атамная энергія служыла мірным мэтам.

Удзельніцы кангрэсу паказалі, якой вялікай і настойлівай сілай з'яўляюцца жанчыны ў сучасным грамадстве. Для пацвярджэння гэтага давайце, дарагія чытачы, успомнім восень мінулага года.

Над рэвалюцыйнай Кубай навіслі ваенныя хмары, якія кожны дзень маглі рассыпацца атамным дажджом над усім светам. Жанчыны Кубы разам з мужчынамі ўзяліся за зброю. «Рукі прэч ад Кубы!» — заявілі жанчыны ЗША і пачалі праводзіць маршы маўчання ля Белага Дома ў Вашынгтоне. Актывісткі Аргенціны не дапусцілі пасылкі сваіх салдат для падаўлення Кубы. «Не чапайце Кубу!» — сказалі жанчыны Уругвая. Рашучасць жанчын розных краін з'явілася адной з прычын, якія стрымалі вайну.

Маці свету ўсведамляюць, што нельга абараніць дзяцей, засланіўшы іх толькі сваім целам. Імкненне захаваць жыццё і шчасце дзяцей зліваецца з барацьбой за мір, за раззбраенне, за нацыянальную незалежнасць свайго народа.

— Без міру няма жыцця, няма шчасця! Мір і раззбраенне — гэта два важнейшыя цяпер словы,— так заявіла сямідзесяцідвухгадовая аўстралійская дэлегатка. І яе горача падтрымалі ўсе прысутныя.

Супраць атамнай вайны ёсць толькі адна абарона, адна гарантыя — усеагульнае і поўнае раззбраенне. Так думае большасць жанчын свету. Раззбраенне аблегчыць іх становішча, палепшыць жыццё народаў. Гарачы водгук у сэрцы жанчын знаходзіць заклік да мірнага суіснавання паміж дзяржавамі з розным сацыяльным ладам, заклік да эканамічнага, культурнага, спартыўнага абмену паміж краінамі.

Найма Бабікор з Судана зазначыла, што нацыянальна-вызваленчы рух у краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі дабіўся каласальных поспехаў толькі ва ўмовах міру. Усеагульны мір неабходны для ажыццяўлення самых лепшых надзей і спадзяванняў жанчын свету.

Вось чаму так узрадаваліся ўсе сумленныя людзі пры падпісанні дагавору ў Маскве паміж СССР, Англіяй і ЗША аб забароне выпрабаванняў ядзернай зброі ў атмасферы, космасе і пад вадой. Маскоўскі дагавор з'явіўся вынікам нястомнай барацьбы народаў усяго свету за забарону ядзернай зброі. Пакладзены пачатак вялікай справе ўмацавання міру. Міралюбівыя народы свету з новай энергіяй уступаюць у бой за прадухіленне вайны.

Пажадаем жа ўсім добрым людзям, усім жанчынам свету плённых поспехаў у іх барацьбе за мір і шчасце на зямлі! Няхай заўсёды ярка свеціць сонца! Няхай хмары вайны не азмрочваюць матчыных сэрцаў!



Відны грамадскі дзеяч Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі Лота Ульбрыхт у зале пасяджэнняў Сусветнага кангрэсу жанчын.

Фота Д. Чарнова.

# НОВЫ ХЛЕБ

Бяда прыйшла нечакана. У Веры Фёдараўны, маладой настаўніцы, сталі балець вочы. Доўга яна ездзіла па бальніцах, нарэшце ўрачы паралі:

— Трэба змяніць спецыяльнасць, няхай адпачнуць вочы.

Гэта азначала расстацца з любімай работай, пачынаць усё спачатку.

Бяссонныя ночы, трывожныя дні. Маці, бачачы Верыны пакуты, сказала аднойчы:

— Можа б ты на поле пайшла... Пакуль паздаравееш...

Веры Фёдараўне было ўсё роўна: на поле дык на поле. І яна разам з іншымі пайшла на палявыя работы. Што б ёй ні даручалі: сеяць, палоць, падкармліваць пасевы,— яна старалася працаваць не горш за іншых жанчын. І не раз у часе работы яна заўважала: сачылі за ёю насцярожаныя вочы, якія, здаецца, гаварылі: «глядзі, вучыцелька, не падкачай». І яна старалася.

Неўзабаве да яе сталі далятаць словы:

— Глянь, а да працы яна здатная.

Гэта была найлепшая пахвала. Калгасніцы прынялі яе ў свой калектыў.

Яны і прапанавалі старшыні назначыць яе звеннявой па льну. І хоць год той выдаўся цяжкі, дажджлівы, — ураджай звяна быў самы лепшы.

Лён своечасова апрацавалі, здалі на завод высокімі нумарамі. Вось тады і загаварылі пра ранейшую настаўніцу, звеннявую калгаса «Перамога» Веру Кулік па ўсім раёне.

І невыпадкова старшыня калгаса Герой Сацыялістычнай Працы Міхаіл Васільевіч Лытысаў запомніў размову, сведкам якой ён быў.

Прыйшла аднойчы Вера Фёдараўна і кажа калгаснаму аграному:

— Чаму дагэтуль няма малатарні?

— Дык жа дождж не дае малаціць,— адмахваўся аграном.

— Нашы снапы пад страхой, дождж тут ні пры чым. Мы канюшню ачысцілі, абсталявалі ток, пазвозілі туды лён. Цяпер жа коні дзень і ноч на пашы.

«Вось гэта дык работнік,— падумаў тады старшыня калгаса.— Не чакае, каб ёй падказалі, што рабіць, сама думае».

Малатарню, вядома, ёй завезлі, і лён быў абмалочан у час. Але пасля гэтага выпадку назначылі Веру Фёдараўну Кулік брыгадзірам самай вялікай вытворчай брыгады, якая аб'ядноўвала дзве вёскі — Майсюціна і Гараўляны.

Клопатаў прыбавілася. З першых дзён яна ўпэўнілася, што адной стараннасці і настойлівасці для брыгадзіра мала. Патрэбны веды. І Вера стала вучыцца. Настойліва, пастаянна. Яе вернымі сябрамі сталі кнігі па агратэхніцы.

Летась брыгада Веры Кулік лепей за ўсіх (а ў калгасе восем брыгад) справілася з усімі сельскагаспадарчымі работамі. Збожжа сабрана на круг сто пудоў з гектара, азімая пшаніца дала ў сярэднім амаль па 28 цэнтнераў. Такіх паказчыкаў не было ні ў адной гаспадарцы ўсёй Віцебскай вобласці. Някепска ўрадзілі бульба і цукровыя буракі.

— Чараўніца ты, Вера,— сказаў неяк жартам брыгадзір суседняй брыгады Віктар Тарасёнак.

— Цудаў на свеце не бывае,— усміхнулася Вера.— Не трэба толькі забываць народную мудрасць: не пашкадуеш трудоў, дык возьмеш з гектара дзвесце пудоў.

Цвёрда памятаюць гэту прымаўку калгаснікі з брыгады Веры Кулік.

Усё ў брыгадзе робіцца па-гаспадарску. І жніво закончылі першыя, і лён выцерабілі і разасланлі, кармоў нарыхтавалі больш за іншых, першыя пачалі сеяць азіміну.

— Азіміну ўбралі раздзельна, за пяць дзён,— кажа Вера Фёдараўна.

Калгаснікі задаволены плёнам сваёй працы. Бралі абавязацельства атрымаць па 20 цэнтнераў жыта з гектара, а намалочваюць па 22, а азімай пшаніцы — амаль па дзвесце пудоў. Вось і памяркуйце: хлебам, які вырасціла брыгада Веры Кулік, можна пракарміць дзве тысячы чалавек круглы год.

Але чамусьці ў астатніх брыгадах атрымліваюць з гектара на паўсотні пудоў менш за Веру Кулік. І тут, вядома, рашаючы ўплыў на ўраджай робяць угнаенні. Пра іх Вера Фёдараўна дбае круглы год. Нават калі наступае гарачы час уборкі, калі не даюць спакою пільныя клопаты нарыхтоўкі кармоў, догляду пасеваў,— брыгада не забывае пра кампосты пад ураджай будучага года.

Яна заўсёды з людзьмі. Кожную раніцу на нарадзе не абміне выпадку пахваліць перадавога чалавека, прысароміць таго, хто адстаў. А раз на тыдзень брыгадзір выступае па калгаснай радыёстанцыі і расказвае пра лепшых людзей брыгады, пра іх слаўныя працоўныя справы.

Па яе ініцыятыве ў летні час у калгасе створаны яслі. На грамадскіх работах адразу прыбавілася больш 200 рук.

Так, у клопатах і справах, мінаюць дні. Адшумелі палеткі залатымі каласамі. Новы хлеб пайшоў у засекі Радзімы. Калгас датэрмінова выканаў першую запаведзь перад дзяржавай і працягвае продаж збожжа звыш плана. І ў гэтым ёсць доля працы калгаснага брыгадзіра Веры Кулік.

**П. МІХЕЙКІН**

Калгас «Перамога»,
Глыбоцкае вытворчае ўпраўленне.





# ВОПЫТ— ВЯЛІКАЯ СПРАВА

Ля свінаматак я працую даўно, каля дзесяці гадоў. Не скажу, што адразу ў мяне справы пайшлі добра. Усяк бывала. Бо, як кажуць, вопыт — справа вялікая. Я маю на ўвазе не толькі свой вопыт, набыты гадамі, але і вопыт перадавых свінарак рэспублікі, і веды, якія дае нам навука.

Здаецца ж, усё вельмі проста: апаросіцца свіння, добра кармі і яе і парасят — і нічога больш не трэба. Але ж гэта не так. Ад свінаркі залежыць, колькі парасят прынясе свінаматка, ці будуць з іх добрыя свінні.

Даглядаю я 25 свінаматак. Атрымліваю ад кожнай з іх за два апаросы па 20 парасят. Працую так. Перш за ўсё сачу, каб групы свінаматак пакрываліся ў адзін і той жа час, тады будуць так званыя туравыя апаросы. Што гэта дае? Я добра ведаю, калі якая група свінаматак будзе парасіцца, і ўжо ночы дзяжуру ў свінарніку, сачу, каб чаго дрэннага не здарылася.

У нашым калгасе праводзіцца так званае племяннное і прамысловае скрыжаванне. Мы, свінаркі, сочым, каб не было роднаснага развядзення. Пры прамысловым міжпародным скрыжаванні павялічваецца пладавітасць свіней, павышаецца вага парасят пры нараджэнні, скарачаецца тэрмін адкорму і зніжаюцца затраты кармоў на кілаграм прыбаўлення ў вазе.

Гаспадарка наша мае мясамалочны напрамак, свінагадоўля займае першае месца. Сёлета толькі за першае паўгоддзе мы прадалі дзяржаве 93 тоны свініны, гэта больш двух планаў.

Як мы даглядаем парасят? Я кажу — мы, бо ўсе нашы свінаркі — Паўліна і Зоя Звяруга, Таццяна і Люба Мяховіч і Марыя Клябан, — стараюцца прынесці як мага больш карысці і калгасу і дзяржаве.

Пачынаючы з пятага дня даём парасяці вугаль, мел, мікраэлементы (нязначныя дозы марганцу, кобальту, меднага купарвасу). Вугаль і крэйда ўмацоўваюць косці парасяці, а мікраэлементы паляпшаюць абмен рэчываў. Амаль адначасова падкормліваем парасят кароўіным малаком. З 7—8 дня наліваем у карытцы чыстую ваду: у такім узросце арганізм расходуе вялікую колькасць вады, і калі яе мала, парушаецца вадзяны абмен. А гэта вельмі шкодна і можа прывесці да хваробы. Ваду мяняем праз 2—3 гадзіны як летам, так і ўзімку, каб яна не забруджвалася. Летам на 10—15 дзень жыцця парасяці ўводзім у рацыён зялёную масу, а зімой — іглiцу. З трох-чатырохдзённага ўзросту выганяем парасят летам на выгульны дворык, а зімой — на спецыяльную пляцоўку ў памяшканні для мацыёну. А вясной усе — і свінні і парасяты — перасяляюцца ў лагер, які знаходзіцца на беразе возера. Чыстае паветра загартоўвае парасят і свіней і засцерагае іх ад лёгачных захворванняў.

Вось, здаецца, і ўсё, што мы робім, каб свінагадоўля ў нас працвітала, каб парасяты нашы раслі хутка і былі здаровыя. Праўда, ёсць у нас яшчэ адна цікавая справа, пра якую я з ахвотай раскажу. Размова ідзе пра корм, які выручыў наш калгас у сёлетнюю веснавую бяскорміцу і які мы даём свінням і парасятам і цяпер. Гэта — сапрапель, адкладанні раслiннага і жывёльнага свету на дне азёр.

Наш ветэрынарны ўрач Аляксандр Герасімавіч Гоман прачытаў аднойчы артыкул акадэміка Х. С. Гарагляда. У артыкуле гаварылася, што на эксперыментальнай базе «Зарэчча» былі праведзены доследы, якія паказалі, што сапрапель — вельмі каштоўны корм для свіней. У ім ёсць бялкі, тлушч, карацін і мікраэлементы. Усё гэта вельмі неабходныя для арганізма рэчывы.

Праверылі нашы азёры і выявілася, што ёсць у нас сапрапель. Гэта цёмная, амаль чорная вадкая каша. І запасаў яго хопіць на шмат гадоў. Пачалі здабываць пакуль яшчэ прымітыўным спосабам.

За рабочы дзень адзін чалавек можа здабыць гэтай бясплатнай кашы каля трох тон. Дадаём туды яшчэ сыроваткі, і свінні ядуць, аж лыч гнецца.

Толькі не думайце, калі ласка, што мы зусім забыліся пра іншыя кармы і пра стварэнне кармавой базы. Не. Усё лета ў нас працуе зялёны канвеер. Закладваем сілас з кукурузы, кармавога лубіну, віка-аўсянай сумесі. На корм свінням пойдуць усе адходы садаводства і гародніцтва. Чакаецца добры ўраджай цукровых буракоў і бульбы.

Нас не палохае зімоўка. Мы добра да яе рыхтуемся. Рашэнні Пленума Цэнтральнага Камітэта нашай партыі аб прывядзенні ў дзеянне ўсіх рэзерваў для ўздыму сельскай гаспадаркі выканаем з гонарам.

**Паўліна ЗВЯРУГА,**
**свінарка калгаса «Ленінскі шлях» Мядзельскага вытворчага ўпраўлення.**



Добры лён на плошчы 145 гектараў вырашчан у сельгасарцелі «Піянер» Капыльскага вытворчага ўпраўлення.
На здымку: цераблённе льну ў 2-й палявoдчай брыгадзе. На пярэднім плане льновад Ніна Рыгораўна Лазюк.

Багаты ўраджай гароднiны збіраюць у саўгасе «Вейна» Магілёўскага вытворчага ўпраўлення.
На здымку: перадавы брыгадзір гароднікаў Лідзія Хамрыцелева.

Урадзіла кукуруза ў сельгасарцелі імя Гастэлы Мінскага вытворчага ўпраўлення. Тут мяркуюць атрымаць не менш 500 цэнтнераў зялёнай масы з гектара.
На здымку: загадчыца жывёлагадоўчай фермы М. В. Гладкая любуецца «каралевай палёў».

Фота П. Наватарава і Н. Жалудовіча.

# Галя



Прысвячаецца звеннявой пальну калгаса «Парыжская камуна» Ляхавіцкага раёна Галіне Чыркун, якая пасля сканчэння дзесяцігодкі працуе ў родным калгасе.

**...І размоў было нямала**
**Языкатым:**
**— Бач, жыве ў калгасе Галя**
**З атэстатам.**
**— Мусіць, вучаным і месцаў**
**Малавата!**
**— А куды ж усім ім дзецца!**
**— Цеснавата...**
**І насілі цёткі хмарай**
**Плёткі тыя.**
**А былі ж у Галі мары**
**Залатыя.**
**Была мара не на два дні —**
**Назаўсёды:**
**У калгасе стаць сапраўдным**
**Паляводам.**
**Шмат няўдач таіла поле**
**Для дзяўчыны,**
**Толькі сэрца не такое**
**У Галіны.**
**Працавала разам з вёскай**
**Дні і ночы.**
**Біўся ў сэрцы камсамольскі**
**Аганёчак.**
**Палюбілі Галю людзі**
**Усёй душою**
**І сказалі: — Няхай будзе**
**Звеннявою.**
**Ой, ты, Галя маладая, —**
**Не здзівіцца.**
**Ой, ты, Галя-звеннявая, —**
**Чараўніца.**
**Заліла палі льняныя**
**Сінявою,**
**Як паводка ў вёсны тыя —**
**Луг вадою.**
**Заліла палі льняныя**
**Морам сінім...**
**Сохнуць хлопцы малaдыя**
**Па Галіне.**

**Іван КІРЭЙЧЫК**

# ПРА ЗАЛАТЫЯ РУКІ...







СКАЗАЦЬ па праўдзе, начальнік цэха не вельмі падобна да начальніка... Можа таму, што пакой-кабінецік яе надта ўжо сціплы і нават цеснаваты. Можа таму, што на просценькім пісьмовым стале паміж тэлефонам і чарнільным прыборам знайшоў сабе месца букецік мілых летніх кветак. А можа таму яшчэ, што ў голасе яе не гучыць начальніцкіх уладных нот...

— Я вам лепей раскажу... Потым пойдзем у цэх, у эксперыментальную лабараторыю, пакажу вам усё. І пішыце вы ўжо лепей самі...

Так, прыкладна, пачынаецца наша знаёмства з начальнікам 1-га швейнага цэха гомельскай трыкатажнай фабрыкі «8 сакавіка» з Антанінай Мікалаеўнай Каўрыдскай.

— А наогул — вы знаёмы з прадукцыяй нашай фабрыкі? Ведаеце, што мы выпускаем?.. — начальнік цэха з выгляду надзіва прыемная жанчына. З ёю лёгка гутарыцца.

— Па-мойму, ведаю... Ну, панчохі, шкарпэткі... Ну, вядома, панчохі капронавыя... Прабачце, не лепшага гатунку...

— Разумею, — усміхаецца Антаніна Мікалаеўна, — капронавыя панчохі, на жаль, яшчэ і сапраўды для жанчын — непамерныя выдаткі. Праўда, гэта бяда не адной толькі нашай фабрыкі.

— Аднак у нас не толькі панчохі... Вось гэта ў нас вязальна-трыкатажны цэх. (Палатно мы вяжам самі. Самі фарбуем — і для гэтага існуе цэх фарбоўкі... Маем два швейныя цэхі. Яны шыюць верхні і ніжні трыкатаж. Кофты, джэмперы, пулаверы, бялізну... Так што, як бачыце, у нас не адны толькі панчохі... На фабрыцы працуе некалькі тысяч работніц. Прадпрыемства ў нас жаночае. І таму, самі разумееце: у нас не толькі алея перадавікоў. У нас не толькі першае месца за паўгоддзе па саўнаргасу. Не толькі калектыўныя паходы ў тэатр і кіно, сумесныя святы, брыгадныя святкаванні дзён нараджэння... У нас ёсць яшчэ і слёзы, і крыўды, і папрокі. У нас яшчэ цяжка і вельмі цяжка з кватэрамі (у фабкоме чакаюць «чаргі» восемсот кватэрных заяў!..) Мы яшчэ не здольны прыняць у сады і яслі ўсіх дзяцей. Хоць і маем фабрычныя яслі, сад і два камбінаты...

Вас, кажаце, цікавяць брыгады камуністычнай працы. Ну, вядома, яны ў нас ёсць. 40 брыгад на фабрыцы. Есць і такія, якія не маюць гэтага ганаровага звання. У маім цэху адна брыгада таксама не носіць гэтага звання. Дзесяць носяць. А адна, адзінаццатая, — не. Чаму? Не таму, вядома, што ў гэту брыгаду мы «сапхнулі» самых горшых работніц. Справа ў тым, што брыгада гэта новая, сабраная з розных канвеераў. І таму калектыў яшчэ не згуртаваўся, не набыў сваіх традыцый, як у брыгадах, дзе работніцы працуюць плячо ў плячо на працягу многіх год... Дзе жыццё кожнага як на далоні. Дзе людзі ведаюць адзін аднаго гэтак жа, як кожны сам сябе ведае. Не дзіўна, што з такім калектывам можна горы варочаць. Бо там адзін за ўсіх і ўсе за аднаго. А гэта і ёсць ужо рысы людзей камуністычнага грамадства. Гэта ўжо і ёсць калектывы, брыгады, якім прысвойваецца высокае званне — камуністычныя.

Аднак і тут не ўсё і не заўсёды гэтак гладка атрымліваецца, як іншы раз пішуць у газетах і часопісах. Было б няпраўдай, няшчырасцю і абязлічкай падраўняць, зачасаць адным грабеньчыкам 580 жанчын — работніц, скажам, з майго цэха.

Возьмем два канкрэтныя прыклады.

...Вам не даводзілася чуць пра такое новае званне — «Майстар залатыя рукі»? Ну дык вось. У адной з лепшых брыгад нашага цэха, у самай вялікай на фабрыцы брыгадзе Ліны Андрэеўны Мельнікавай, дзе за год мяняецца да пяцідзесяці фасонаў, работніцы ўспрымалі кожны новы фасон, скажам адкрыта, без асаблівага энтузіязму... Адны бурчэлі сабе пад нос, другія папракалі начальства ўголас. Самі разумееце — у сэнсе заробку гэта не вельмі выгадна... Толькі вывучыў, прывык да аднаго фасону, як раптам — зноў ламай усё, зноў вывучай, зноў прызвычайвайся...

І вось аднойчы на брыгадным сходзе ўстае Марыя Пазнякова (яе партрэт вы можаце ўбачыць на алеі перадавікоў). Работніца яна была не сказаць, каб самая перадавая ў брыгадзе. Сціплая такая. Не вельмі прыкметная. Устае і кажа, што для таго, каб не было прастояў, калі часам суседка «саб'ецца з нагі» або не выйдзе на работу (самі разумееце, жанчыны: у адной дзіця захварэла, другая сама занядужыла, а тая жыве адна, без мужа, дык таксама ўвесь клопат на адных плячах), — яна хоча









★

Не будзе перавелічэннем сказаць, што ўся радасць новага, радасць вынаходніцтва нараджаецца тут, у эксперыментальнай лабараторыі, дзе думаюць, хвалююцца і нямала спрачаюцца мастакі-мадэльеры Клаўдзія Георгіеўна Вайчунас, Любоў Акімаўна Сакалова і Лідзія Еўдакімаўна Ярэмава. Гэта іхняй фантазіяй народжаны цудоўны малюнак трыкатажнага палатна. Гэта імі створана безліч прыгожых фасонаў, ад якой разбягаюцца вочы. Паглядзіце на здымкі — хіба гэта не праўда?..

★

# РАДАСНА ІСЦІ ПЕРШЫМ...

Скажыце, вы любіце апранацца прыгожа?..

Напэўна, ва ўсім свеце не знойдзеш жанчыну, якая адмоўна адказала б на гэта пытанне. Кожнай хочацца апранацца модна, з добрым густам і — няхай даруюць жанчыны, калі я адкрыю іх запаветную мару, — так, каб гэта не наносіла асабліва цяжкіх страт сямейнаму бюджэту.

У жанчын ёсць яшчэ адзін сакрэт: заўсёды хочацца, каб твая сукенка была крыху не такая, як нават у лепшай сяброўкі, каб яна штосьці падкрэслівала, штосьці гаварыла, каб была «твая». Ці ж не праўда?

Які адсюль вывад? Трэба, каб на прылаўках магазінаў ляжалі тканіны прыгожыя і самыя розныя, на кожны колер вачэй, кожную постаць і, магчыма, нават усмешку. Аб гэтым клапоцяцца нашы тэкстыльшчыкі.

Дык вось, сёння размова пра тых, хто нас апранае, і пра тое, у што нас апранаюць. Давайце наведаем Гродзенскі тонкасуконны камбінат.

— Новыя станкі? — у другі раз перапытаў Генадзь Сямёнавіч Сіманові́ч, старшы інжынер тэхнічнага аддзела. І ўздыхнуў: — Зноў, значыць, аб новых станках?

Каб зразумець яго правільна, трэба ўдакладніць адну дэталь. Справа ў тым, што Гродзенскі тонкасуконны камбінат асвойвае партыю новых шэрсцеткацкіх станкоў. Як і ў кожнай незнаёмай справе, бываюць у гэтым працэсе і радасныя, і сумныя эпізоды: новае ўваходзіць у жыццё нялёгка. А вось цікаўных пакуль што менш не становіцца: многія жадаюць даведацца аб станках. І прыходзяць, і пішуць, і звоняць.

Генадзь Сямёнавіч усміхаецца крыху стомлена:

— Машыны вельмі цікавыя. Але наладжваць экскурсіі амаль штодня нельга. Ведаеце што, зрабіце добрую справу, раскажыце пра іх...

Я выконваю яго просьбу.

...Чалавеку, які не працаваў на ткацкім прадпрыемстве, у гэтым цэху нялёгка. Калі звяртаюцца з пытаннем, ён у засмучэнні разводзіць рукамі, нават спрабуе адказваць, думаючы, што субяседнік гэтак жа, як і ён, нічога за шумам не пачуе. Яму нешта расказваюць — ён стараецца зрабіць выгляд, нібыта што-кольвечы зразумеў...

Дзяўчаты-ткачыхі звычайна не крыўдзяць такіх вось крыху разгубленых навічкоў. Знаходзяць цішэйшае месца, стараюцца памагчы.

...Маша Абраменка, намеснік сакратара камсамольскага камітэта і мой экскурсавод па камбінаце, ідзе праз ткацкі цэх, нешта расказвае, вітаецца з дзяўчатамі. Мінаем цэх, потым невялікі пралёт, і — дзіўна! — я нечакана чую, аб чым гаво-

першая паспрабаваць асвоіць усе працэсы на ўсім брыгадным абсталяванні... Што гэта азначае — вы лёгка зразумееце. Вось паглядзіце, колькі ў нас розных машын і колькі розных аперацый на кожнай машыне можна выканаць...

І Марыя Пазнякова не толькі сказала аб сваім намеры, які яна выношвала, безумоўна, не адзін дзень. Не толькі паабяцала брыгадзе, што яна яго ажыццявіць. Яна яго ажыццявіла!

Вось адкуль яно нарадзілася, гэта новае званне «Майстар залатыя рукі». Нарадзілася яно ў брыгадзе камуністычнай працы, дружнай, спаянай, дзе ніколі не пакінуць цябе ў бядзе таварышкі, дзе пасобяць, калі цяжка, дзе падменяць... Дзе, аднак, і спуску не дадуць, не даруюць, калі ты парушыш традыцыю і святы закон брыгады...

А цяпер другі прыклад.

Тая ж самая брыгада. Тыя ж самыя людзі... Прабачце, мне трэба наведацца ў райвыканком. Выклікаюць па справах...— спыняе нашу гутарку Антаніна Мікалаеўна. — Вы пакуль што пазнаёмцеся вось з гэтым дакументам... А калі я вярнуся — мы працягнем размову...

І Антаніна Мікалаеўна пакідае мяне на адзіноце з пратаколам № 4 агульнага сходу работніц швейнага цэха № 1 ад 5 ліпеня 1963 года. Прысутнічала 264 чалавекі.

На парадку дня стаяла адно пытанне: разбор справы работніцы Г., якая ўкрала дзве пары трусоў.

Дакладвала сходу брыгадзір Ліна Андрэеўна Мельнікава.

Так, гэта іх брыгада першая на фабрыцы патрабавала ў дырэкцыі адмяніць агляд работніц на прахадной... І вось у іх жа брыгадзе знайшоўся чалавек, які адважыўся кінуць пляму на ўвесь калектыў, які зганьбіў яго высокае камуністычнае званне, які пакваліўся на кавалак палатна... І вось вынік... Тая, што яшчэ ўчора сядзела як роўная сярод сваіх таварышак, сёння ўжо не мае права на гэта таварыства. Яна яго зганьбавала, і яна павінна за гэта паплаціцца.

«Зволіць» — гэтага ў адзін голас патрабаваў агульны сход цэха. Зволіць, тым больш, што некалі раней калектыў цэха ўжо быў літасцівы да Г., папярэджваў яе, калі заўважыў за ёю нядобрае...

Воля калектыву фабкомам і дырэкцыяй была выканана.

...Вярнуўшыся з райвыканкома, Антаніна Мікалаеўна працягвае расказваць пра жыццё і справы свайго цэха, пра жыццё і справы фабрыкі.

— Не пакінулі... Не прынялі, хоць і прыходзіла, і прасілася потым,— адказвае яна на маё пытанне: а можа варта было б пакінуць Г. на фабрыцы, магчыма, яна перавыхавалася б...

— Каб не было папярэджання, безумоўна, падумалі б,— гаворыць начальнік цэха.— А так — мы не можам ігнараваць волю калектыву... Не паважаць яе. Вы чыталі пратакол — усе як адна работніцы патрабавалі такога рашэння.

І сапраўды, чаму вельмі часта мы лічым, што выхоўваць — гэта толькі няньчыцца, толькі ўгаворваць і ўпрошваць... А чаму — не караць? Калі чалавек вінаваты, няхай кара прымусіць яго ўспомніць пра тых, каго ён абкрадаў, каму маніў.

Успомніць — і апомніцца. На ўсё жыццё!

— Так што, як бачыце, пунсовыя хусцінкі — гэта ўсё вельмі складана,— задумена працягвае Антаніна Мікалаеўна. — Дарэчы, пра колер хусцінак... Мы спрабавалі завесці пунсовыя ва ўсіх работніц. Аднак, разумееце, колер — гэта толькі знешні бок справы. І сярод пунсовых хусцінак траплялія часам шэрыя і нават... чорныя. І, наадварот, сярод блакітных ці белых часам расцвіталі такія пунсовыя! І тады мы махнулі рукою на колер:

— Насіце, дзяўчаты, хусцінкі ўсіх колераў! Так, бадай, яшчэ прыгажэй будзе. Няхай толькі і справы вашы расцвітаюць гэтак жа, як і вашы хусцінкі.

І справы ў цэху сапраўды «цвітуць». Аб гэтым сведчыць безліч чырвоных сцяжкоў на рабочых сталах з надпісам «Ударнік камуністычнай працы»...

— А цяпер вернемся крыху назад. Зноў да залатых рук,— кажа Антаніна Мікалаеўна. — Дык вось. Пасля таго, як Марыя Пазнякова заявіла пра свой пачын, задумаліся над гэтым і многія іншыя. Нялёгкая справа, вядома. Але цяпер на фабрыцы ёсць ужо чатыры работніцы за званнем «Майстар залатыя рукі». А колькі ў іх паслядоўніц — і падлічыць цяжка...

Ну, і калі ўжо размова ідзе пра лепшых, пра тое, каб сказаць аб іх на старонках рэспубліканскага часопіса, то неабходна назваць такія брыгады: Ліны Андрэеўны Мельнікавай, Наталлі Цімафееўны Аверкінай, Аляксандры Беніямінаўны Хаўкінай...

— А наогул — усе брыгады ў нас малайцы,— лёгка падагульняе гутарку начальнік цэха.— Люблю я свой цэх. Звыклася, зраднілася з ім, як з родным домам... З сорак дзевятага года тут працую...

І Антаніна Мікалаеўна яшчэ доўга расказвае пра свой цэх. Расказвае цёпла, любоўна, з гонарам. Так любяць гаварыць пра сваю сям'ю гаспадыні, у якіх заўсёды добры парадак і лад...

Запісала гутарку Алена ВАСІЛЕВІЧ

рыць Маша. Магчыма, скончылася змена і пачаўся абедзенны перапынак? Чаму стала значна цішэй?

Дык вось якія яны, новыя станкі! Першае слова, якое хочацца пра іх сказаць,— сучасныя. Гэта сучаснасць ва ўсім: у новай форме — станкі нізкія, зручныя, не перашкаджаюць ткачысе бачыць амаль увесь цэх; нават у новай афарбоўцы — нейкай шэра-зялёнай ці шэра-блакітнай, якая прыемна радуе вока. І, галоўнае, працуюць значна цішэй.

...Ткачыха за крайнім станком нечым нагадвае дзяўчынку-падлетка. Можа сваёй рухавасцю ці шчырай адкрытай усмешкай.

Зіна здзіўляецца: як гэта можна палічыць яе за дзяўчынку?

— Я — старэйшае пакаленне,— жартуе яна.— На камбінаце восьмы год, сына выгадавала, а вы — падлетак...

Восем гадоў адлічыў час з таго дня, калі дзяўчынка пераступіла парог камбіната і па-дзіцячы заткнула вушы пальцамі: шумна! Заплюшчыла вочы, пастаяла хвілінку так, потым адкрыла і рашыла для сябе: цікава. І засталася...



Асвоіўшы работу на новых станках, камсамолка Зінаіда Пракапюк (злева) вучыць ткачыху Зінаіду Чыпігу.

Калі былі ў вас непрыемнасці ў жыцці, калі ахапіла стомленасць ці стала сумна, павучыцеся ў Зіны Пракапюк, пазайздросціце ёй: праз гады працы яна пранесла запал, неспакой маладосці і, галоўнае, здзіўленне, радасць ад новага. Вы ведаеце, як гэта здарова,— не развучыцца здзіўляцца!

У той дзень працавалася асабліва весела: быццам побач чакала вялікая радасць. Вось і кажы пасля гэтага, што сэрца не падказвае. Калі да Зіны падышоў Аляксей Міхайлавіч Бібікаў, зменны майстар, яна зрабіла крок наперад і патрабавальнарадасна спытала сама:

— Ну, што?

— Дык ты ведаеш? — Аляксей Міхайлавіч нават пакрыўдзіўся, што не ён першы прынёс гэтую навіну.— Едзеш?

— Еду...

А Зіна і не ведала яшчэ, куды едзе. Проста сэрца падказала, што не маглі не паслаць яе вучыцца, каб пасля працаваць на новых станках. Яна не магла не быць першай...

На Монінскі камбінат, пад Маскву, ехалі ўтрох: Зара Баклакова, Зіна Пракапюк і Люда Зярнова. Зара — інструктар рабочых навыкаў, Зіна і Люда — лепшыя ткачыхі. У кожнай за плячыма салідны багаж ведаў: калі не інстытут, дык тэкстыльны тэхнікум абавязкова. І доўгі час работы на прадпрыемстве.

Дні, праведзеныя на Монінскім камбінаце, прамільгнулі непрыкметна. У канцы мінулага года жанчыны ўпершыню сталі за новыя бясшумныя станкі. Трэба было рыхтаваць новых ткачых: адбіралі асабліва ўважліва, на новыя машыны ішлі працаваць тыя, хто вучыўся ў інстытуце, тэхнікуме або ў вячэрняй школе.



— Добрыя вашы станкі,— гаворыць ткачыха Браніслава Ягадкіна (злева) наладчыку Васілю Рашатняку, які прыехаў для рэгуліроўкі новых станкоў з завода «Сібтэкстыльмаш».

Фота П. Нікіціна.

А сёння побач з Зарай, Зінай, Людай працуюць Святлана Петражыцкая, Таня Сямчук, Галіна Рабенка, Зіна Кетурка, іх вучаніцы і сяброўкі.

Вы бачылі красны, на якіх ткалі нашы бабулі? Нельга, вядома, ставіць побач з імі сучасны ткацкі станок, але ёсць у рабоце абодвух нешта агульнае: у чаўнок закладваецца шпулька (інакш гэта называецца пачаткам з ніткамі), і ён з вялікай сілай праштурхоўваецца праз туга нацягнутую аснову. Для параўнання возьмем дзве лічбы: вага чаўнака — каля аднаго кілаграма, хуткасць, калі гэта можна назваць хуткасцю,— 95 удараў за мінуту. Плюс шум...

Зіна Пракапюк трымае на далоні невялічкую металічную дэталь. Якое можа быць параўнанне! Вага новага чаўнака — 40 грамаў, хуткасць — 250 удараў за мінуту і без шуму.

Маша, як сапраўдны экскурсавод, працягвае тлумачыць:

— У новай машыне такіх чаўнакоў можа быць ад 9 да 17. У нашай, напрыклад, іх 13.

Уявіце сабе малюнак: трынаццаць маленькіх чаўначкоў адзін за адным захопліваюць нітку з вялікай бабіны (не трэба намотваць стограмовыя пачаткі), нясуць яе з хуткасцю, якую цяжка ўбачыць, і, калі аўтамат на другім канцы тканіны адсячэ нітку, замацоўваюць яе ды слізгаюць уніз па жалабку зноў да бабіны. Плюс яшчэ адно: станок аўтаматычна выключаецца, калі абрываецца нітка на аснове ці ўтоку. Значыць, поўнасцю закрыта дарога браку.

Аблягчаецца праца ткачыхі, лепшая становіцца тканіна, узрастае прадукцыйнасць працы. У колькі разоў? Паспрабуйце падлічыць. Вось што пра гэта гаворыць Генадзь Сямёнавіч.

— Раней ткачыха магла працаваць на двух-трох станках, а новых яна будзе абслугоўваць чатыры—шэсць. Магчыма і восем,— інжынер хітравата ўсміхаецца, і зразумела, чаму: не хоча раскідацца абяцаннямі наперад...

Нялёгка ісці першым... Усюды нялёгка: і ў паходзе, і за станком. Так і ў гродзенцаў: новае абсталяванне патрабуе асаблівай увагі, выключных клопатаў. Але калі на цябе з зайздрасцю глядзяць такі паважаны ў рэспубліцы чалавек, як ткачыха Алена Лазарэнка, радасна быць першым...

Калі канчаецца змена, ткачыха акуратна малюе мелам стрэлачкі на тканіне і піша сваё прозвішча. Гэта для кантралёра, каб можна было даведацца, колькі зроблена за змену.

У той дзень блакітныя стрэлкі ішлі па сіняму школьнаму трыко, карычневыя — па тканіне для дзіцячых касцюмаў. А хутка побач з імі будуць намотвацца на рулоны і юнацкі драп, і іншыя прыгожыя тканіны.

Ведаеце, што сказала на развітанне Зіна Пракапюк?

— За гадзіну на адным станку можна ў сярэднім вытkаць шэсць метраў школьнага трыко. Падлічыце, колькі хлапчукоў і дзяўчынак я апранаю за змену.

А калі яна будзе працаваць, як расказваў Генадзь Сямёнавіч, на шасці, на васьмі станках? І хіба ж гэта мяжа?

Паспрабуйце, сябры, падлічыце...

**Ірына УГАЛЬНІК**

# ГІМН ПРАЦЫ

...Сабраліся аднойчы Мароз, Сонца, Вецер, Хмара і не маглі вырашыць — хто з іх дужэйшы? Добры майстар Мароз: за адну ноч пабудуе мост цераз шпаркую раку, пашые сает на ўвесь свет. Але прыгрэе Сонца — растануць Марозавы будынкі. Сонца абуджае прыроду ад сну, дае жыццё раслінам. Толькі і яно не ўсемагутнае: закрые Хмара неба — і знікне святло. А Вецер дужэйшы за Хмару, гоніць яе, куды хоча.

Спрэчку вырашыў Чалавек. Ён загадаў Ветру падняць гару — і той не змог. Выходзіць, гара дужэйшая за ўсіх? Не, гара не можа справіцца з лесам, які точыць яе сваім карэннем. Падняў сякеру Чалавек, пачаў сячы дубы. І ўсе прызналі, што

Людская праца — уладар.
Яна на свеце гаспадар!

А вось другая казка з кніжкі Ул. Дубоўкі «Кветкі — Сонцавы дзеткі»:

...Харавство ўсё ідзе ад працы.

Не фантастычныя істоты, не ўсемагутныя чараўнікі з'яўляюцца героямі паэтычных казак Ул. Дубоўкі. Героі іх — звычайныя людзі або непрыкметныя звяры і маленькія птушкі. Чароўную сілу надаюць ім працавітасць, умельства, кемлівасць, дабрата, імкненне памагчы сваім сябрам («Залатое дно», «Дзяўчына і кілім», «Музыка-чарадзейнік»).

І, наадварот, жыццё сурова карае гультая, скнару, няўмеку, ашуканца. Як тую прыгожую нанайскую дзяўчыну Айогу, якая стала гускай і крычыць над вадой: «Я Айога-га-га!». Сквапнага і ганарыстага Васпана Пыха перахітрыў звычайны сялянскі хлопец («Вяльможны Пых»). Ашуканка Лісіца асталася без кашы («Як яны проса сеялі»).

У пасляслоўі кнігі паведамляецца, што «казкі збольшага ўзяты з народнае скарбніцы. Аўтар надаў ім вершаваную форму і суладзіў іх кампазіцыйна». На нашу думку, такая ацэнка працы паэта занадта сціплая. Скарыстаўшы сюжэты народных казак, Ул. Дубоўка стварыў самастойныя паэтычныя творы. Казачныя персанажы нібы пераселіліся ў сённяшні дзень, жывуць нашымі думкамі і марамі, робяць так, як зрабіў бы на іх месцы наш сучаснік. Аб гэтым гаворыць і сам аўтар у лірычных адступленнях і ўступах да некаторых казак. Так, удала звязвае ён казачнае з сучасным у паэтычным абрамленні казкі «Кветкі — Сонцавы дзеткі».

Цеплаходам едзе паэт па шырокай Прыпяці:

Насустрач ідуць рудавозы няспынна,
вянкамі агнёў каляровых убраны.
І нам,
і бязмежным прасторам Айчыны
сігналяць агнямі сваімі:
— Дабранач!

У вадзе адлюстраваліся зоркі — нібы закрасавалі лілеі. Дзяўчына пачынае расказваць казку, як Сонца аддало людзям свае зоркі, а Месяц пашкадаваў. Таму і стаў адзінокі, халодны.

Паэтычны кантраст паміж нашай рэчаіснасцю, створанай самааддана калектыўнай працай савецкіх людзей, і казачным сквапным, адзінокім Месяцам набывае глыбокі ідэйны сэнс, робіць вялікае эмацыянальнае ўздзеянне.

Кніга заканчваецца цудоўнай «Старобінскай казкай — Салігорскай быллю». Гэта — усхваляваны расказ аб вялікай новабудоўлі рэспублікі, аб працоўным подзвігу нашых людзей. Сёння явай сталі самыя запаветныя мары народа.

Мы цяпер мяжу згубілі:
дзе тут казкі, дзе тут былі...

Незлічоныя багацці знайшлі людзі ў зямлі «ля Старобіна старога». Тут вырас новы горад-казка Салігорск — векапомны помнік плённай працы.

Гэта казка стала явай
і вялікай нашай славай.

Напісаныя жывой народнай мовай казкі Ул. Дубоўкі вучаць дзяцей любіць працу, быць умелымі, дапытлівымі і кемлівымі, жыць у дружбе, любіць сваю Радзіму.

Хведар ЖЫЧКА



Уладзімір ДУБОЎКА

# ІШАК І ВЯРБЛЮД

Вярблюд вялікі, а ішак маленькі,
ён вярблюду быў толькі па калені.

Хоць гэта так, але жылі сябрамі,
вазілі збожжа, на будоўлі — камень.

Гаспадароў вазілі не аднойчы,
і шмат чаго пабачылі іх вочы...

Яны ніколі не былі без працы.
Вось і цяпер прыйшлося ім сабрацца,

як і не раз бывала, у дарогу.
Вярблюд паклікаў ішака малога.

Паклалі ім пакункі цераз спіны.
Яны пайшлі сваёю пуцявінай.

Ідуць-брыдуць па Індыі шырокай,
а там дзівосаў шмат на кожным кроку.

На пальмах там лісты, як парасоны.
А пальма ўся нібы шацёр зялёны...

А на бананах — даўжынёй такія,
што ліст адзін цябе зусім закрые...

І птушкі там, як матылькі, бываюць,
а матылькі, як птушкі, вырастаюць...

Дзівосаў многа, і злічыць няможна,
ды і ля іх трымайся асцярожна.

Там тыгры ходзяць цераз джунглі ўночы,
шакалы там і плачуць, і рагочуць...

Там кракадзілы плаваюць у рэках
і не баяцца нават чалавека...

Ні снегу там не знаюць, ні марозу,
спякота — там найбольшая пагроза...

Вярблюд ідзе, за ім ішак памалу.
Ужо і ноша плечы нацягала.

І адпачыць бы каля дрэва трэба,
бо сонца паліць і зямлю, і неба.

Якраз рака загарадзіла шлях ім.
Вярблюд і бухнуў у раку з размаху,

аж пырскі узняліся над вадою.
Вярблюд здаволіўся, ківае галавою:

пакуль пяройдзе брод, напіцца можна.
Ішак глядзіць на пераход трывожна.

Стаіць на беразе ішак, чакае,
пакуль вярблюд бакі свае купае.

Вярблюд паклікаў ішака у воду:
— Ідзі сюды, як я, таксама з ходу!

Зусім тут, кажа сябар, неглыбока,
а прахалоды колькі тут навокал!

На розум свой ішак усё узважыў
ды сябру, верблюду, ў адказ і кажа:

— Так, так, мой сябар, жарты не малыя!
Табе вада аж грудзі, бачу, мые!

Мяне ж яна закрые з галавою,
а што я добрае спаткаю пад вадою?

З'ядуць мяне адразу кракадзілы,
змагацца з імі я не маю сілы...

Я лепш прайду суседнім пераходам.
Спытаўшы броду, я палезу ў воду...



# ПАЯЗДЫ МЧАЦЦА МІМА...

Апошнія мінуты перад адыходам поезда самыя бязладныя. Ужо і развіталіся і пажадалі ўсяго добрага на дарогу, а поезд нібы марудзіць. Тады здаецца, што на самай справе штосьці важнае не сказана, штосьці забыта. І пачынаюць ад'язджаючыя ліхаманкава пісаць на шыбах, паказваць на жэстах. Але вось паравоз уздрыгвае, павольна рушыць з месца. Праплываюць вакзальныя будынкі, прыгарады, і поезд вырываецца на прастору. Нібы кадры на экране, мільгаюць прыдарожныя краявіды ў вокнах вагонаў. Падступаюць шчыльнай сцяной панурыя елкі, весела ківаюць услед замілаваныя бярозкі, раптам зачаруе красой лясное возера.

І сярод усяго гэтага характэва мільгаюць прымошчаныя ля самай дарогі домікі пуцявых абходчыкаў.

Прагрыміць, праімчыцца састаў, а чалавек з жоўтым сцяжком астаецца адзін каля самотнай будкі...

Загадкай здаецца жыццё гэтага домiка і людзей, якія кожны дзень праводзяць у дарогу саставы, а самі астаюцца на месцы. Чыгунка для іх існуе, здаецца, толькі для таго, каб мераць яе пеша па шпалах — восем кіламетраў у адзін канец, восем — у другі.

І хочацца пакінуць утульнае купэ, завітаць да гаспадароў доміка ля дарогі, даведацца, як і чым жывуць гэтыя людзі.

Скорыя паязды ў Мінойтах затрымліваюцца ўсяго на адну мінуту. Нібы спатыкнецца стальны конь, сцішыць крок, уздыхне на ўсе грудзі — і зноў бяжыць, цягнучы за сабою доўгую чараду зялёных вагонаў. Вось яны ўжо ледзь відны. Рэйкі збягаюцца ў тоненькую ніточку, поезд знікае на даляглядзе. Толькі пранізліва пракрычыць паравозны гудок.

За акном прастукаў таварны састаў, хутка павінен прайсці пасажырскі. А мужа няма і няма. Яшчэ ўдзень паехаў у Ліду па выкліку начальніка дыстанцыі пуці, абяцаў вярнуцца праз якія дзве гадзіны і вось — затрымліваецца.

Яўгеня Раманаўна сабрала няхітры інструмент пуцявога абходчыка, паклікала сына:

— Мар'ян, пойдзем на пуць. Пакуль бацька не вярнуўся, трэба агледзець.

Мар'яна клікаць два разы не трэба. Накінуў пінжачок — і гатоў. Бацька прывучыў дзяцей памагаць у рабоце. Аднаму часам не ўправіцца, а на ўчастку ўсё павінна быць у поўным парадку. Прабіваецца трава каля шпал — гэта ўжо непарадак, дзесьці гайка адышла — непарадак, а бывае рэйка лопне — гэта ўжо надзвычайнае здарэнне, не ўгледзіш — і да няшчасця недалёка. І стаіць пуцявы абходчык на пасту. Жоўты сцяжок ветліва кажа машыністу:

— Будзь спакойны. На ўчастку ўсё ў парадку. Шчаслівай дарогі!

Паязды бягуць, спяшаюцца. А пуцявы абходчык астаецца.

Мар'яну шаснаццаць. Незразумела часам хлопчыку, як можна так доўга аставацца на адным месцы, калі так прызыўна крычаць саставы, клічуць у нязнаныя гарады, у заманлівую блакітную даль.

— Скончу школу — паеду,— калі-нікалі скажа Мар'ян.

Ёсць у хлопца мара. Адкуль яна прыйшла на паўстанак, дзе нават рэчкі добрай паблізу няма, цяжка сказаць, але кліча Мар'яна мора. Хоча стаць мараком.

Вочы Яўгені Раманаўны мякка жмурацца, маршчынкі-праменьчыкі разбягаюцца па твары. Ну, няхай будзе сын мараком. Хіба прывяжаш яго да роднага дома! А сама ўпотай спадзяецца — можа, яшчэ перадумае Мар'ян. Хацелася б маці, каб сын стаў машыністам і вадзіў саставы. Сярод ночы пазнавала б яго машыну па гудку, нават па стуку колаў.

Выраслі дзеці. Калі — і не заўважыла. Здаецца, ці даўно сама была такая, як дачушка Ева. А вось пяты дзесятак падкрадаецца.

Жыццё... Яно было нялёгкае. Паўгалоднае дзяцінства. У сям'і сямёра дзяцей. Ранняя смерць бацькі, вечныя матчыны клопаты пра кавалак хлеба для дзяцей. Рана скончылася дзяцінства. Працавала ў людзей — пасвіла жывёлу, няньчыла дзяцей. Потым пайшла працаваць на чыгунку. Тут і сустрэлася з Уладзіславам, маладым пуцявым абходчыкам. Пайшлі па жыцці разам. Дваццаць год будзяць іх начамі паравозныя гудкі, дваццаць год праносяцца міма пасажырскія і таварныя саставы.

Каб беглі бесперапынна паязды, дзень і ноч стаяць на сваім пасту пуцявы абходчык Уладзіслаў Барыс і яго жонка Яўгеня

# ПАШТАЛЬЁН

Больш дзесяці год ходзіць па вясковай вуліцы з хаты ў хату калгасны паштальён Людміла Мікалаеўна Сафонава. Ходзіць па хатах і раздае разам з поштай цеплыню свайго чулага сэрца.

Працоўны дзень паштальёна пачынаецца рана. За некалькі кіламетраў крочыць яна ў Горкаўскае аддзяленне сувязі па пошту, каб потым разнесці яе людзям.

— Люсечка, чакаем цябе кожнага дня, а ты рэдка да нас заходзіш,— скардзіцца старая цётка Хвядора. Людміла задумалася: і сапраўды, сумна жывуць старыя, пісьмы да іх рэдка прыходзяць. Не аднойчы бачыла Люся, як сядзіць стары за «святой» кнігай і нешта мармыча сабе пад нос.

— Калі хочаце, буду кожнага дня да вас заходзіць. Падпішыцеся на газету. Прынясу вам газету і пачытаю навіны.

Старыя згадзіліся. Так на аднаго падпісчыка ў вёсцы болей стала і яшчэ падзяку ад людзей заслужыла.

Заходзіць паштальён у другую хату. Бачыць, Аксеня Сцёсава шые на машыне.

— Вось шыеце, цётка, а мод у вас няма.

— Няма, Люсечка, няма, а без іх што за работа, усляпую рабіць прыходзіцца.

— А вы выпішыце які-небудзь жаночы часопіс. Напрыклад, «Крестьянку» або «Работніцу і сялянку». Там друкуюць моды і да кожнага нумара дадатак з выкрайкамі прыкладаецца. Апрача таго, друкуюць там шмат цікавага.

З удзячнасцю прыняла цётка Аксеня прапанову. Крочыць далей паштальён. Заходзіць аддаць пісьмо Стальмаховым. Тут жа афармляе падпіску на газету.

Так, ідучы ад хаты да хаты, шмат карыснага робіць Люда людзям. Яна расказа і пра новыя будоўлі ў нашай краіне, пра тое, колькі намаганняў прыкладае наш урад, каб захаваць мір на зямлі. І пра ўсё гэта паштальён гаворыць з запалам, горача.

Ходзіць па вёсцы дзяўчына з паштовай сумкай цераз плячо. А сумка з кожным годам становіцца ўсё цяжэй і цяжэй. Сёлета, напрыклад, падпіскаю на газеты і часопісы ахоплен кожны двор, а ў некаторых сем'і па некалькі выданняў ідзе.

Новых поспехаў табе, калгасны паштальён наш Людміла Сафонава!

**І. КАТОЎСКІ**

п. а. Горкі
Мсціслаўскага раёна.

Раманаўна. Пасля вайны цяжкавата было. Чыгуначнае палатно на ўчастку ледзь ліпіць, рэйкі часта лопаюцца. Глядзі пільна, а то нядоўга і да бяды. Яўгеня Раманаўна памагала мужу.

Потым, калі памянялі рэйкі, умацавалі палатно, працаваць стала лягчэй, больш бяспечна. Тады і адмянілі начныя дзяжурствы для пуцявых абходчыкаў.

Але яшчэ доўга ўсхопліваўся муж па начах пры кожным сігнале поезда. Усё не мог прызвычаіцца. Бывала, пакуль не пройдуць усе паязды па графіку, не засне. Варочаецца, уздыхае.

З цягам часу клопатаў стала менш. І Яўгеня Раманаўна сказала аднойчы мужу:

— З работай цяпер ты, бадай, справішся і адзін. Хопіць мне пры табе ў памочніках хадзіць. Буду працаваць у калгасе, не хапае там рабочых рук.

І пайшла ў палявую брыгаду. Цяпер у Яўгені Раманаўны паявіліся свае клопаты.

Выдзелілі ёй у брыгадзе ўчастак цукровых буракоў. Ад сяўбы і да збору ўраджаю кожная калгасніца адказвае за сваю дзялянку. Ну і разгарнулася спаборніцтва — усім хацелася пахваліцца сваім ураджаем. Работы з буракамі нямала — прапалоць, прарваць, падкарміць. І зноў уся сям'я Барыс сабралася разам, усе выходзілі працаваць на маміным участку. У доме з'явіліся кніжкі аб вырошчванні цукровых буракоў. Усё, што пісалася пра гэту незнаёмую культуру ў газетах, абавязкова прачытвалася. А калі ў канцы лета здавалі ўраджай і аказаўся ён у Яўгені Раманаўны адным з лепшых,— Уладзіслаў Казіміравіч радаваўся больш за ўсіх.

— Вось налета я паспрабую іначай пасеяць, радзей,— тады ўраджай будзе яшчэ лепшы.

І вельмі смуткаваў, калі налета цукровыя буракі пасадзілі ў другой брыгадзе — не ўдалося свой вопыт правесці.

Суседзі здзіўляюцца:

— У вас не ўцяміш, хто дзе працуе. Хіба толькі тады, калі ў ведамасцях на зарплату распісваецеся.

А дзеці дома жартавалі: цяпер у нас у сям'і ўсе слаі грамадства: тата — рабочы клас, мама — сялянства, Ева — служачая, паштальёнам працуе, Ала — студэнтка, будучы медык, а Мар'ян пакуль школьнік.

Тата аднойчы прыехаў з упраўлення дыстанцыі пуці і, загадкава ўсміхаючыся, спытаў:

— Як мы, па-вашаму, жывём?

— Добра,— пацiснуў плячыма Мар'ян.

— Я не пра тое. Як мы працуем? Па-ўдарнаму?

І расказаў бацька, як урачыста ўручылі яму сёння ва ўпраўленні каштоўны падарунак, як шмат добрых слоў сказалі пра яго работу на чыгунцы і потым аб'явілі, што яму аднаму з першых на дыстанцыі прысвоена званне ўдарніка камуністычнай працы.

— Значыць, уся наша сям'я — ударная.

Вечарамі, калі ўся сям'я збіраецца ў доме, Ева кладзе на стол газеты. У кожнага свая: тут і «Гудок», і «Медицинская газета», і «Комсомольская правда». І тады пакой ператвараецца ў чытальную залу.

Яўгеня Раманаўна стараецца ў гэтыя гадзіны не грымець пасудай, ходзіць ледзь чутна. Хто-небудзь пачынае чытаць голасна — няхай і мама паслухае. Любіць яна такія мінуты. Да кнігі, да газеты, да падручнікаў сына яна ставіцца з глыбокай пашанай. Не давялося ёй самой вучыцца ў панскай Польшчы, але затое яе дзеці ўсе атрымліваюць адукацыю.

Вось і першы дыплом паявіўся ў доме: Ала скончыла медыцынскае вучылішча, едзе працаваць у сельскую бальніцу на Брэстчыну. Пакуль медыцынскай сястрой. Але надумала цвёрда — праз два гады будзе паступаць у інстытут. Хоча быць урачом.

Ведаюць і Яўгеня Раманаўна і Уладзіслаў Казіміравіч — будзе дачка ўрачом. Бо цяпер такі час — усе мары збываюцца.



**Уся сям'я Барыс у зборы: Уладзіслаў Казіміравіч і Яўгеня Раманаўна з дзецьмі Евай, Алай і Мар'янам.**

Здзейсніцца і Мар'янава мара. Скончыць школу, і паімчыць яго з дому поезд, які больш за дваццаць год прабягаў міма будкі пуцявога абходчыка.

— У кожнага свой графік,— кажа Уладзіслаў Казіміравіч.— Не ўтрымаеш, калі мара кліча.

Весела свецяцца электрычнасцю вокны, прыёмнік прыносіць у дом пуцявога абходчыка на невялікім паўстанку галасы з усяго свету. А побач імчацца паязды. Вязуць лес, трактары, вугаль, аўтамабілі. Едуць будаўнікі, маладыя спецыялісты, шахцёры. Краіна працуе. І калі камусьці здалося загадкай жыццё доміка пуцявога абходчыка — няхай увойдзе. Тут сустрэнуць радасна. Тут таксама працуюць, падпарадкоўваючыся адзінаму працоўнаму рытму краіны. Тут людзі таксама на пасту, а таму іх жыццё поўна рамантыкі.

**Э. ЛУКАНСКАЯ**

Ліда, 12-я дыстанцыя пуці.

**Уладзіслаў Казіміравіч Барыс абходзіць свой участак.**



# СЯМ'Я КРЫЛАТЫХ



Герой Савецкага Саюза Раіса Ермалаеўна Аронава, жонка Леаніда Пляца.

**Нарыс**

Кучамі шугалі ў неба галкі. Здавалася, нечыя нябачныя дужыя рукі жменямі шпурлялі іх у блакітную бездань...

Ціха ў невялічкім доме, што патанае ў маладой зеляніне. Цёплы ветрык стомлена перабірае сівыя валасы гаспадароў — яны сядзяць на прызбе. Наставіўшы брылем далонь, жанчына доўга ўглядаецца ў вясновы блакіт неба.

Можа, там яе сын? Ці мала іх, яе сыноў, старэйшы ўжо... Які то- ныя зоркі, паглядзець на лётчыка, свайго аднавяскоўца...

Старая ўсміхаецца сваім думкам. Хвалямі наплываюць успаміны. Гады, гады...

Яны са Сцяпанам не паспелі азірнуцца, як, бач, састарэліся, унукаў нагадавалі.

Няхай, адно, надыдзе лета, і зляцяцца адусюль у Азярцы іх сакаляняты. Дачка Ніна, што ў Віцебску настаўнічае, абавяз-



**Злева направа: у першым радзе — Ніна і Іван, у другім радзе — Леанід, Міхаіл і Анатоль Пляц.**

— Сцяпан, можа, гэта Лёня наш? — трывожна звяртаецца да мужа Наталля Майсееўна.

— Мо і Лёня,— спакойна пыхае люлькай Сцяпан Паўлавіч,— а мо і Міхась. Такая, маці, у іх прафесія. Мы з табой поле аром, а яны — неба. Вышэй, значыць, за нас забраліся.

Наталля Майсееўна моўчкі папраўляе пасмачку валасоў і цяжка ўздыхае. Неадрыўна сочыць за серабрыстымі кропелькамі-самалётамі, а думкамі ўжо далёка, далёка...

Успамінаецца, як вярнуўся з грамадзянскай вайны Сцяпан, вось гэткай парой, вясною... Вярнуўся, а старэйшы сын, Змітрок, ужо дарослы... Працягвае бацьку паперку. Аказваецца, хлопца выклікаюць на вучобу ў Ленінград, у лётную школу... Скончыў на «выдатна».

...Успомнілася, як Змітрок прыляцеў і пасадзіў сваю сталёвую птушку непадалёк ад роднае вёскі. Сходзіліся людзі паглядзець самалёт, на крылах якога былі намаляваны чырвокова прыедзе. Сыны Анатоль і Іван з Мінска. Леанід і Міхаіл з Масквы. Прыедуць з дзецьмі. Вось ужо радасці і смеху дзіцячага ў хаце будзе!

* * *

...Змітрок першы ў сям'і адкрыў «авіяцыйную лінію». Зрабіў некалькі тысяч палётаў, пакрыўшы адлегласць больш за два мільёны кіламетраў.

Па гэтай жа дарозе пайшоў і другі сын — Леанід. І ён стаў лётчыкам. Ды яшчэ якім! На многіх тыпах самалётаў давялося лятаць Леаніду Сцяпанавічу за 27 год службы ў авіяцыі. Больш як шэсць тысяч гадзін прабыў ён у паветры, навучыў лётнай справе звыш васьмісот чалавек. Зараз Леанід — палярны лётчык. Водзіць свой самалёт праз снежныя завеі далёка за Палярным кругам...

Трэці — Міхаіл,— скончыўшы школу, пайшоў таксама следам за братамі.

— І я ў авіяцыйнае вучылішча! І болей нікуды!

У Міхася быў свой план. Ён хацеў скончыць вучылішча і абавязкова трапіць у экіпаж да аднаго з братоў. Таму і вырашыў стаць штурманам. Вайна застала яго ў лётнай школе. Датэрмінова здаўшы экзамены, малады штурман прыбыў на фронт.

Шэсцьсот трыццаць шэсць баявых вылетаў зрабіў Міхаіл Пляц у тыя суровыя гады вайны. Яго бамбардзіроўшчык з'яўляўся над хрыбтамі Каўказа, вогненным смерчам спапяляў ворага ў Крыме, граміў яго ў роднай Беларусі. На рахунку Міхаіла Пляца дваццаць тры разбітыя склады праціўніка з боепрыпасамі, трыццаць аўтамашын, дзве патопленыя пераправы з гітлераўскай тэхнікай, баржа з войскамі, безліч гармат, мінамётаў, ля дзесятка чыгуначных эшалонаў і тысячы гітлераўцаў. Падпалкоўнік авіяцыі Міхаіл Сцяпанавіч Пляц працягвае сваю штурманскую службу і цяпер, ужо ў мірных умовах.

* * *

Раіса Аронава вучылася тады ў Саратаўскім інстытуце механізацыі сельскай гаспадаркі. Неяк, вяртаючыся з практычных заняткаў, заўважыла яна ў небе серабрыстыя планеры. Стаяла сярод збажыны і доўга глядзела ім услед зайздрослівым позіркам.

— Падабаецца? — пачула яна за спіной добразычлівы голас свайго аднакурсніка.— Слухай, Рая. А чаму б табе не запісацца ў аэраклуб?

Гэта вырашыла лёс дзяўчыны.

Студэнткай застала яе вайна. Рая кідае вучобу і добраахвотнікам ідзе на фронт. Дзяўчыну залічылі ў полк начных бамбардзіроўшчыкаў.

Дзевяцьсот шэсцьдзесят вылетаў зрабіла Раіса за гады вайны. Спачатку яна была штурманам. Калі ў баі загінуў яе камандзір, Рая звярнулася да камандавання палка:

— Дазвольце заняць месца маёй сяброўкі.

Камандзір палка Еўдакія Бершадская не здзівілася. Пільна паглядзела ёй у вочы і ціха сказала:

— Дазваляю, лейтэнант. Прымайце самалёт...

...Экіпаж Раісы вяртаўся з задання. Недзе там, у глыбокім тыле ворага, палаў гітлераўскі склад з боепрыпасамі.

— Уперадзе — «МЕ-109»! — пачуўся ў навушніках трывожны голас штурмана. Раіса ўздрыгнула ад нечаканасці. У той жа момант пачуўся яе звонкі голас:

— Падрыхтавацца!

Няроўны паядынак працягваўся паўгадзіны. Вопытны фашысцкі лётчык са шматлікімі крыжамі на фюзеляжы азвярэў. Атакі следавалі адна за другой. Дарэмна. Калі б гітлеравец ведаў, што самалётам кіруе дваццацігадовая дзяўчына, ён, напэўна, ашалеў бы ад злосці. А між тым «У-2» амаль ушчыльную прыціскаўся да самай зямлі, усё далей і далей пакідаючы ў хвасце раз'юшанага крыжаносца.

У гэты ж дзень Раіса пазнаёмілася з Леанідам Пляцам. Гэта знаёмства моцна звязала іх на ўсё жыццё...

* * *

Смяшлівай дзяўчынкай прыйшла ў полк Руфіна Гашава, студэнтка механіка-матэматычнага факультэта Маскоўскага ўніверсітэта імя Ламаносава.

Снежаньская ноч 1944 года запомнілася Руфіне на ўсё жыццё. Экіпаж вяртаўся з удалай бамбёжкі — узляцеў у паветра буйны чыгуначны мост. Начное неба перакрэслівалі ракеты.

— Зараз прызямлімся, Руфа, і гарачага кіпяточку пап'ём! — весела сказала Ольга Санфірава — камандзір экіпажа.— З шакаладам!

У той жа момант абедзвюх асляпілі промні пражэктараў. Машыну страсянула. Яркае полымя асвяціла кабіну.

— У бензабак трапіў снарад! — крыкнула Руфіна.



Герой Савецкага Саюза Руфіна Сяргееўна Гашава, жонка Міхаіла Пляца.



Дзмітрый Сцяпанавіч Пляц.

— Бачу,— адказала Санфірава. — Паспрабуем дацягнуць да сваіх.

Палаючая машына ўпарта працягвала свой шлях. Яны ўжо былі за лініяй фронту, калі агонь пачаў лізаць кабіну.

— Штурман! Пакінуць самалёт! — загадала Санфірава.

Яны вываліліся з самалёта ў чорную бездань ночы. Прызямліліся на нейтральнай паласе, проста ў цэнтры міннага поля. У цемры Ольга Санфірава трапіла на міну...

Руфіна нейкім цудам працягвала свой шлях сярод смерці, якая затаілася ў зямлі. На сваіх плячах яна несла Санфіраву.

Пасля гэтага Руфіну накіравалі ў экіпаж Надзеі Паповай. Да канца вайны яна зрабіла яшчэ больш як 50 баявых вылетаў, помсцячы ворагу за смерць сяброўкі.

За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, Руфіне Сяргееўне Гашавай і Раісе Ермалаеўне Аронавай было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Пасля вайны Руфіна і Раіса скончылі інстытут замежных моваў і працуюць у Маскве.

— Дзе знойдзеш такіх нявестак, як у мяне?! — часам падкруціць сівы вус Сцяпан Паўлавіч.— Дзівіся не дзівіся — героі!

Потым закурыць люльку, пыхне дымам і жартаўліва дадасць:

— Крышку падкачалі мае хлопцы...

* * *

Мы сустрэліся з Наталляй Майсееўнай і Сцяпанам Паўлавічам ва ўрачысты для іх дзень. Уся сям'я сабралася на святкаванне 80-годдзя гаспадароў. Сцяпан Паўлавіч урачыста сядзеў за сталом. Вакол яго — цесным колам сыны, дачка, унукі. Наталля Майсееўна заняла сваё месца побач з маўклівым ад хвалявання мужам.

— Прабачце, Наталля Майсееўна! — пачуўся голас з суседняга пакоя. Усе павярнуліся. У дзвярах стаяў паштальён.

— Вам тэрміновая тэлеграма з Масквы.

— Давай, голубе. Ад каго ж гэта? — устаў Сцяпан Паўлавіч і паволі надзеў акуляры.

«Дарагія Наталля Майсееўна і Сцяпан Паўлавіч! У дзень вашага васьмідзесяцігоддзя Ваенны савет Ваенна-Паветраных Сіл Саюза ССР шле вам, славутым савецкім патрыётам, гарачае прывітанне. Вы выхавалі мужных і дастойных воінаў-авіятараў. У суровыя гады Айчыннай вайны сярод мужных лётчыкаў змагаліся і вашы сыны Дзмітрый, Міхаіл і Іван.

І цяпер палярны лётчык Леанід, афіцэр Ваенна-Паветраных Сіл Міхаіл, інжынер Грамадзянскага паветранага флоту Іван добрасумленна служаць. аддаюць усе свае сілы і веды ўмацаванню магутнасці нашага паветранага флоту. Вашу сям'ю справядліва называюць крылатай.

Ад усяго сэрца жадаем вам, дарагія Наталля Майсееўна і Сцяпан Паўлавіч, добрага здароўя, вялікага шчасця і доўгіх гадоў жыцця.

Ваенны савет Ваенна-Паветраных Сіл СССР».

Сям'ю крылатых вітала сама Радзіма.

Наталля Майсееўна і Сцяпан Паўлавіч Пляц, бацькі сям'і крылатых.





**А. ШЛЕГ, Я. КУЧАР.**

Талачынскі раён.

# ЦЯПЛО ЧАЛАВЕЧАЕ...

— Раскажыце, Ольга Сцяпанаўна, як вы ў гады Вялікай Айчыннай вайны прытулілі ў сябе чужога хлопчыка?

— Чужы хлопчык? — задуменна перапытала Ольга Сцяпанаўна.— Быў чужы, а цяпер стаў самы родны. Гэта ж мой сын...— яна падумала і прадаўжала: — Было гэта дажджлівым асеннім вечарам 1941 года. Секла дровы я ў двары, бо не было каму: жыла ўдавой з пяцігадовым сынам Аляксандрам. Муж загінуў на фінскай вайне. Раптам ззаду мяне пачуўся голас:

— Добры дзень, цёця!

Я разагнулася і ўбачыла перад сабой хлопчыка гадоў дванаццаці. На ім былі салдацкая шапка з паламаным брылем, кашуля, парваныя штонікі, на босых нагах — старыя галёшы. Худзенькія плечы яго дрыжэлі, з патрэсканых губ сачылася кроў. Слёзы сціснулі мне горла. Я павяла хлопчыка ў дом і накарміла, чым мела. Падзякаваўшы мне, хлопчык сабраўся адыходзіць.

— Куды ж ты пойдзеш? — запытала я.

— Пайду шукаць месца для начлегу,— адказаў ён.

— А дзе ж ты думаеш шукаць?

— У стозе сена, у гумне.

— Нікуды ты не пойдзеш,— сказала я.— Лезь на печ, грэйся і гуляй з маім Сашам. Будзеш жыць у нас.

Часам пужалі мяне людзі:

— Ой, глядзі, Ольга, пападзе табе ад немцаў: прыёмны Аляксандр падобны да яўрэя.

І наклікалі ліха. Аднойчы зайшлі два гітлераўцы з перакладчыцай у двор і засталі там аднаго Аляксандра.

— Юдэ? — крыкнуў фашыст. Я выбегла з хаты з Сашам на руках, прыціснула да сябе Аляксандра.

— Гэта мой сын! — сказала я.

Фашыст вырваў у мяне хлопчыка і з сілай кінуў на зямлю. Ён моцна ўдарыўся, з носа і губ яго пацякла кроў.

— Страляйце маці дваіх дзяцей! Страляйце мяне першую!

Гэта, напэўна, пераканала іх, што я не маню. Ды яшчэ перакладчыца пачала ім нешта казаць: мусіць, каб яны нас не чапалі...

Скончылася тым, што гітлераўцы зайшлі ў хлеў, злавілі дзвюх курыц і пайшлі... Так і жыў Аляксандр у мяне. А пасля вайны пайшоў служыць у армію. Часта піша. Камандаванне часці прыслала мне падзяку.

Ольга Сцяпанаўна падышла да шафы і дастала фота.

— Гэта ён з жонкай і дзецьмі, маімі ўнучкамі...

— А дзе ж цяпер Аляксандр? — запытаў я.

— Жыве і працуе ў Бабруйску. А калі хочаце яго пабачыць, дык прыходзьце ў суботу. Ён часта прыязджае дамоў на матацыкле.

...Аляксандр Дзмітрыевіч Лабцэвіч цяпер працуе на заводзе гумава-тэхнічных вырабаў і з сыноўняй любоўю адносіцца да Ольгі Сцяпанаўны Субоцкай. Да свае маці...

**С. ГРЫБОЎСКІ**

Веска Міхалёва
Бабруйскага раёна.

Мелодыя вальса прабівалася скрозь шыбы вокнаў, настойліва клікала ў прасторную залу калгаснага клуба. Лёгка хадзілі на шарнірах шырокія ўваходныя дзверы. Але Іван Гарасімаў з сілай рвануў іх і стаў на парозе, нібы жадаючы напомніць аднавяскоўцам: «Вось я— які!». Шапка хвацка заломлена набок, у роце папяроса. У гэтыя хвіліны ён падабаўся сам сабе. Іменна такім маляваў Іван аблічча «першага хлопца на сяле». Ён угледзеў сярод танцуючых Марыйку Кавалёву і пачаў прабірацца да яе.

Дзяўчына пагардліва глянула на «першага хлопца» і адышла з незалежным выглядам. Для Івана гэта было так нечакана, што ён нават збянтэжыўся. Потым, ледзь стрымліваючы злосць, зноў падышоў да Марыйкі.

— З такімі ў нас не танцуюць! — рашуча адрэзала дзяўчына.

— Гэта з якімі — «такімі»? — узгарэўся Іван. Рвануўся ён, як звычайна, «шумнуць», каб ад грому скандалу задрыжалі сцены клуба. Азірнуўся — яго акружыла група дзяўчат. «Толькі паспрабуй парушыць парадак, зараз жа выставім вон!»

Змрочны адышоў Іван Гарасімаў убок і толькі тады заўважыў: інакш праходзілі цяпер танцы, чым раней. Хлопцы былі без шапак, не дымілі папяросамі. Іван злосна кінуў у урну недакурак, паклаў на свабодны падаконнік шапку. Толькі тады яго больш ветла сустрэлі дзяўчаты.

За два тыдні да гэтага ў Цярэніцкім «клубе дзяўчат» горача абмяркоўвалася крыху незвычайнае пытанне. Ішла размова пра этыкет танца,— так ахарактарызавала яго сутнасць маладая даярка Лідзія Жукава.

— Нядобра, дзяўчаты! — гнеўна гаварыла яна.— Уваліцца на танцы які-небудзь хлопец, патыхае ад яго на кіламетр гарэлкай, шапка набок, цыгарэта ў зубах. Пойдзеш з ім у пары — пыхкае дымам у вочы. Нібы ласку робіць, што з табой танцуе...

— Гэта ж прыніжае нашу жаночую годнасць! — надала яшчэ большую вастрыню размове Лідзіна равесніца даярка Марыя Мінава. — Давайце дадзім зарок: не танцаваць з такімі.

Доўгі вечар мінуў, як кароткая гадзіна. Так і асталіся нераскрытымі сшыткі, прынесеныя на чарговыя заняткі па дамаводству. Але ніхто не шкадаваў аб гэтым. Такая размова была вельмі патрэбна. І ўдзельніцы «клуба» вырашылі не танцаваць з хлопцамі, якія не ўмеюць паважаць дзяўчат. Няхай тыя, хто бравіруе непрыгожымі замашкамі, адчуюць на сабе сілу грамадскага асуджэння.

«Клуб дзяўчат» вёскі Цярэнічы — дзецішча жансавета. Не адразу склалася праграма гэтага клуба. Хацелася, каб асталяваліся ў яго сценах шчырая іскрыстая весялосць былых вясковых вячорак і разам з тым — цікавае, карыснае правядзенне вольнага часу.

— Больш за ўсё нам трэба баяцца, каб не загубіла добрую справу нуда, каб не ператварыўся дзявочы наш клуб у клуб маладых бабуль,— выказала апасенне член жансавета льнаводка Галіна Лашкевіч.

З чаго ж пачаць?

Дапамаглі самі калгасніцы.

— Першыя заняткі вырашылі прысвяціць кулінарыі,— гаворыць старшыня жаночага савета Лідзія Піліпаўна Вініцкая. — Арганізавалі школу сельскіх кулінарак.

Узялася кіраваць ёю пенсіянерка Лідзія Георгіеўна Ігнатовіч. Шмат папрацавала яна на прадпрыемствах грамадскага харчавання. Аднойчы прыехала наведаць дачку Іну, якая працуе дырэктарам мясцовай васьмігодкі, ды так і асталася тут. Спадабаліся маляўнічыя тутэйшыя мясціны. Таварыская па свайму характару, Лідзія Георгіеўна ўважліва прыглядалася да быту цярэніцкіх калгаснікаў. І ёй вельмі хацелася быць ім чым-небудзь карыснай.

— Давайце адкрыем школу кулінарыі,— прапанавала яна старшыні жансавета. — Няхай абедзеннае меню ў сельскай сям'і будзе не горшае, як у горадзе.



У падрыхтоўчым цэху Віцебскай шоўкаткацкай фабрыкі працуе пасля заканчэння школы камсамолка ўдарнік камуністычнай працы Зямфіра Валодчанкава. Яна выконвае норму на 120—130 працэнтаў.

Фота М. Мінковіча.

Адна з першых выказала жаданне займацца ў кулінарнай школе жонка бухгалтара Вера Скварцова. Дастаўлялі ёй нямала непрыемнасцей кухонныя клопаты. Як ні спяшайся, а прыгатаванне ежы адымала кожны дзень добрыя тры гадзіны. І самае горшае — не заўсёды нават гаспадыні падабалася яе «прадукцыя». Не хапала ўмельства.

Хоць вольнага часу было ў абрэз, Вера пачала рэгулярна наведваць заняткі па кулінарыі. Яны праводзіліся два разы ў месяц. Думалася, што хадзіць будзе толькі «зялёная» моладзь, але побач з маладой гаспадыняй Верай Скварцовай селі за парту пяцідзесяцігадовыя Васіліса Дарашкова і Саклета Зянькова. Салідная розніца ва ўзросце не замінала вывучаць кулінарнае майстэрства.

На ўроках Лідзіі Георгіеўны школьны клас ператвараўся ў цэх сталовай. Выявілася, што далёка не ўсе сельскія гаспадыні ўмелі правільна ацэньваць спецыфічныя асаблівасці хадавых харчовых прадуктаў, не ўсе ведалі, як трэба ўжываць прыправы.

«Тэхналогія» прыгатавання мучных страў так зацікавіла калгасніц, што па іх просьбе Лідзія Георгіеўна правяла некалькі дадатковых заняткаў. Здаючы свой чарговы «залік», Зінаіда Сазонава прадставіла на ўсеагульны агляд і ацэнку ўмела прыгатаваныя ёю грыбкі з крэмам. На дзіва смачным пячэннем частавала сваіх сяброўак Таццяна Мінава, удалы торт спякла Вера Скварцова. Так практычна быў падрыхтаван «семінар», прысвечаны сервіроўцы святочнага стала.

Спрабавалі калгасніцы гатаваць кансервы з гародніны. І тут пераканаліся, што варта толькі прыкласці старанне — і закуска атрымліваецца вельмі смачная. Нават заняткі, на якіх гаварылася пра захоўванне гародніны, нямала падказалі кашто̂ўнага сельскім гаспадыням. Шмат знайшлося ў Лідзіі Георгіеўны здольных вучаніц.

Вось якія добрыя справы пачаў Цярэніцкі жаночы савет.

А колькі яшчэ іх наперадзе! Цікавыя лекцыі, гутаркі на розныя хвалюючыя тэмы...

М. КАЧАВЫ

Гомельскі раён.



# ДОБРЫ ПАЧАТАК

# СЯБАР І ДАРАДЧЫК

Жаночы савет на фабрыцы — новая, бадай, самая маладая арганізацыя. У яго ўваходзяць дзевяць жанчын розных прафесій. Асноўныя пытанні нашай работы — выхаванне дзяцей і быт. Бо калі маці спакойна за сваіх дзяцей — яна зробіць тканіны больш і лепшай якасці.

Ніводнае свята ў дзіцячым садзе не адбываецца без удзелу жаночага савета. Мы памагаем шыць касцюмы, удзельнічаем у размеркаванні падарункаў, упрыгожваем навагоднія ёлкі. Аднойчы член жансавета Зіна Салдатава прапанавала правесці ў дзіцячым садзе свята зімы. Мы папрасілі галоўнага механіка фабрыкі Лазара Якаўлевіча Зеліковіча зрабіць адмысловыя санкі, упрыгожылі іх. З чырвонымі сцягамі-плакатамі «Бывай, зіма, — прывітанне, вясна!», з песнямі і музыкай каталіся нашы дзеці, вадзілі карагоды на лёдзе, ляпілі снежную бабу. Весела было дзецям, вельмі задаволены былі бацькі, дзякавалі нам і выхавацельніцы дзіцячага сада.

Мы актыўна ўдзельнічаем у размеркаванні месц у дзіцячым садзе і яслях, пуцёвак у піянерскі лагер. Жаночы савет цесна звязаны са школамі. Работнік парасілавой гаспадаркі Мікалай Мехаў мала звяртаў увагі на выхаванне свайго сына Сцёпы, які хадзіў у другі клас. Хлопчык здольны, але бацькі часта не пускалі яго ў школу, прымушаючы няньчыць дзвюх маленькіх сястрычак. Сцёпа хадзіў непадстрыжаны, брудны, не меў касцюма для фізкультуры. Мы пабывалі дома ў Мехава, звярнуліся ў фабрычны камітэт з просьбай аказаць яго сям'і матэрыяльную дапамогу. Цяпер хлопчыка не пазнаць.

Некалькі членаў жаночага савета разам з урачом медпункта сочаць за санітарным станам жылых дамоў, за ўзаемаадносінамі жыхароў.

Ніна Яцук, Ада Кавалёва і ўрач праверылі санітарны стан сталовай і кухні і выявілі шмат недахопаў: брудныя каструлі і бляхі, беспарадак у халадзільніках. Мы напісалі дакладную на імя дырэктара сталовай, а таксама ў фабрычны камітэт, унеслі свае прапановы, як навесці чысціню ў сталовай. Парадак там палепшыўся, але мы не аслабляем кантролю за сталовай і кухняй.

Ткачыха Броня Краўчанка выйшла замуж, аднак шчасце яе было кароткае: загінуў муж. Сваякоў у Броні няма. Хутка яна нарадзіла сына. Мы хадзілі да яе ў радзільны дом, шчыра віншавалі з нованароджаным, стараліся адцягнуць маладую жанчыну ад невясёлых думак. А пасля памаглі ўладкаваць дзіця ў яслі, атрымаць жыллё. Цяпер Броня жыве добра, працуе, ёй далі асобны пакой, сыночак расце здаровы і вясёлы.

**ВЕСТКІ З ЖАНСАВЕТАЎ**

Па ініцыятыве жаночага савета арганізаван гурток крою на грамадскіх асновах. Фруза Яскевіч, Аксана Валодзіна, Алена Рудакова і член жансавета Ніна Кавалёва кожную сераду па чарзе праводзяць заняткі. Каля пяцісот жанчын ужо навучыліся кроіць і сказалі дзякуй нашаму жансавету.

Жаночы савет працуе ў цеснай сувязі з фабрычным камітэтам і партарганізацыяй.

**М. ГУСАКОВА,**
**старшыня жансавета Віцебскай шоўкаткацкай фабрыкі.**

## НАДЗЕЙНЫ ПАМОЧНІК

У калгасе «За Радзіму» Гомельскага раёна жанчыны займаюць многія камандныя пасады. Старшыня праўлення — Герой Сацыялістычнай Працы П. Н. Кавалёва, тры з чатырох комплексных брыгад узначальваюць жанчыны, два аграномы — таксама жанчыны. А колькі тут жанчын паляводаў, жывёлаводаў, гародніц!

Вось чаму ў калгасе такое вялікае значэнне надаюць жансавету, так клапатліва наладжваюць яго работу. На чале жансавета — брыгадзір передавой комплекснай брыгады Т. Е. Барабанцава.

Добра працуюць жанчыны ў гэтай брыгадзе! Брыгада займае першае месца ў калгасе па надоях малака. За шэсць месяцаў гэтага года надоена па 1.478 кілаграмаў малака ў сярэднім ад кожнай каровы.

Вось так умеюць працаваць жанчыны ў калгасе «За Радзіму». А яны яшчэ і вучацца, і дзяцей гадуюць, і адпачываюць весела.

Гэта жанчыны аб'явілі вайну п'янству. «Не павінна быць п'яных на нашых вуліцах!» — так вырашыў жансавет. І свайго дабіваецца.

Жанчыны пачалі паход за чысціню на вуліцах вёсак і ў дамах, не даюць спакою неахайным. А колькі дрэў высаджана на вуліцах па ініцыятыве жансавета!

Жансавет — ва ўсім надзейны памочнік нашай партарганізацыі.

**А. МЯЛЬЯНЦАЎ,**
**сакратар партарганізацыі калгаса «За Радзіму» Гомельскага раёна.**

**У горадзе Магілёве жывуць і працуюць былыя партызанкі сёстры Хаўранковы. Нядаўна да іх у госці прыехала з Чэхаславакіі Таццяна Аляксандраўна Дачакалава.**

**Аднойчы Таццяна Аляксандраўна прачытала ў часопісе «Работница» нарыс аб сёстрах-партызанках, расказала пра яго на заводзе, затым разам з сяброўкамі напісала пісьмо Хаўранковым. З таго часу паміж чэхаславацкімі і савецкімі жанчынамі завязалася дружба, якая мацнела з кожным днём. Яны абменьваліся пісьмамі, віншаваннямі, сувенірамі, кнігамі, альбомамі. Самы дарагі падарунак для сясцёр-партызанак — пано з відамі Маскоўскага Крамля і Прагі, вышытае рукамі сябровак з Чэхаславакіі.**

**Цёпла і радасна сустрэлі Таццяну Аляксандраўну ў Магілёве. Усюды яна была жаданай госцяй.**



На здымку: **Т. А. Дачакалава** (другая злева) **сярод сясцёр Хаўранковых.**

Фота Н. Жалудовіча.

# Было гэта ці не?..



**Янка БРЫЛЬ**

Урывак з рамана

Мал. **Ю. Пучынскага.**

***У адзінаццатым-дванаццатым нумарах часопіса „Полымя" будзе друкавацца раман Янкі Брыля „Птушкі і гнёзды".***

***Разам з героем гэтай кнігі Алесем Руневічам і яго аднагодкамі чытач пройдзе па сцежках маленства і маладосці таго пакалення нашых сучаснікаў, што паспытала нядолі і барацьбы ў былой Заходняй Беларусі, прайшло праз агонь польска-нямецкай кампаніі ў верасні 1939 года, зведала пекла гітлераўскіх лагераў, хваляванні і цяжкасці ўцёкаў з палону, да родных разбураных гнёздаў, шчасце абараняць іх разам са сваім народам у партызанскіх атрадах.***

***Імкненне да святла праз цемру нацыянальна-сацыяльнага прыгнёту; інтэрнацыянальная дружба прадстаўнікоў многіх народаў; харошая чалавечая дружба, якую гартавала ўласцівая ўсім сумленным людзям нянавісць да фашызму; савецкі патрыятызм — сыноўняя любоў да першай на Зямлі краіны Саветаў; цудоўны свет высокіх пачуццяў кахання; роздум над будучыняй, над найвышэйшым прызваннем — быць Чалавекам, — вось што складае змест рамана, урывак з якога мы прапануем увазе чытача.***

* * *

...Чакаючы гудка, яны памалу ішлі па заводскім двары, лена размаўляючы, — і рабочыя-немцы, і палонныя, — усе разморана сагрэтыя высокім чэрвеньскім сонцам.

Стройная фройляйн, брунетка, ішла ім насустрач. Не ў прахадную, аднак, а спынілася ў натоўпе і, павітаўшыся весела, звярнулася да майстра Нідынга:

— Гер інжынір прасіў чатыры чалавекі. На адны паўгадзіны.

Пануры халасцяк ажыў пад промнямі спакуслівай маладосці,— зашапялявіў, заўсміхаўся галантна, задыгаў смешна доўгім падбародкам:

— Ды выбірайце, мілая, сама. Я думаю, што з вамі пойдзе кожны...

І фройляйн стала выбіраць. Ды, зрэшты, і не выбірала, а паказала пальцам на Алеся, першага з краю:

— Вы, калі ласка.

Побач з ім, як заўсёды, стаяў Андрэй Мазалёк.

— Вы таксама. І вы. Ну, і вы, калі ласка. І хопіць. Два вялікія і два малыя. — Яна бяскрыўдна засмяялася. — Прашу за мной.

Фройляйн была прыгожая. Нейкая простая, блізкая сіла — здароўе і спрыт. І, божа мой, колькі пяшчотнасці выпраменьваюць, як хвалююць і нізка адкрытая шыя, і да плячэй загарэлыя, поўныя рукі, і маладосцю паднятыя, гордыя грудзі! Пад тонкімі чорнымі брывамі — вялікія карыя вочы. Смяецца... Ведае сабе цану! Як жа смяецца! Вось павярнулася, пайшла, а вочы, вусны, зубы — яшчэ ўсё смяюцца ў тваіх вачах. Стрыжка пад хлопца — мілы чорны «бубікопф». А як жыве на ёй — нібы богведама колькі і кім дабіраная — простая, светлая, хітрая сукенка над стройнымі, поўнымі, загарэлымі лыткамі!..

Гэтак думаў Алесь. Дзе там — думалі ўсе чатырох. Бо вось Андрэй не вытрываў:

— Ну, браце, бабка! Цс, цс...

І тут стаўся цуд—фройляйн павярнулася да іх на хаду і з нейкім вельмі ж натуральным, а ўсё ж і какетлівым смехам сказала:

— Не гэска[1] бабка. Стара бабка!..

— Слечна[2] гавожы па-чэску?! — усцешана, здзіўлена крыкнуў Андрэй.

— Слечна сама ест чэшка,— зноў засмяялася дзяўчына.

Пачаліся ўзаемныя роспыты: хто вы, адкуль, як ваша імя, а вы як навучыліся па-нашаму...

Яна — Іржыка, і яе — вельмі проста цяпер, у вайну — прывезлі сюды на работу, яна служыць пакаёўкай у галоўнага інжынера.

Ну, а ён, Андрэй, палонны з польскай арміі, беларус, летась у гэты час прайшоў цераз усю Чэхію і папаўся ажно каля самай Мараўскай Астравы...

Яны гаварылі толькі ўдваіх, што па-чэшску, што па-нямецку, а што і так разумеючы, проста з вачэй. А трое астатніх,— Алесь, Венік і ціхі, доўгі Васілевіч,— слухалі, калі меркаваць па Алесю, раўніва.

І не заўважылі, як хутка выйшлі з тэрыторыі гуты, дайшлі пад соснамі да белага катэджа.

Што там! — яны не адчувалі цяжару таго, што валаклі неўзабаве з партэра на паверх: пры гэтай дзяўчыне раяль здаўся ім... от, нібы ложак які, хоць Венік пасля і казаў, што ледзь не зайшоўся, не вякнуў, не...

У доме дзяўчына не было нікога, апроч іх. Потым спыталіся, і Іржыка сказала, што фраў і дзеці паехалі ў горад, а сам на заводзе. Пасмялеўшы, палонныя пачалі разглядацца, дзівіцца з яшчэ нябачанай раскошы.

[1] Гэска — прыгожая.
[2] Слечна — дзяўчына, паненка.

А потым, у партэры, слечна звярнулася зноў да Алеся:

— Пойдтэ, просім, дале[1],— паказала на дзверы і пайшла першая.

Дурата маладая! Яму няпрошана прыпомніўся анекдот. Пані паклікала старога дзядзьку-сталяра ў другі пакой, каб заплаціць яму за работу. А ён спалохаўся: «Мне, панечка, у маіх гадах, лепш ужо чарку гарэлкі»... Так ён, Алесь, і ўсміхнуўся хлопцам з дзвярэй, міжволі і непатрэбна зачыняючы іх за сабою.

А за дзвярыма, у кухні, яму стала сорамна. І горача. Не ад сораму толькі, ад хмелю крыві. Ажно цяжка ісці, ажно страшна і нельга вымавіць слова.

Яна ж як быццам была спакойная. Завіхнулася каля буфета і, шчабечучы прыязна ды гасцінна, падала яму чатыры бутэрброды.

— Урчыта матэ гляд. Йеном то снэзтэ йіндэ. А ныні сэ розлоўчым і з вашымі пшыятэлі[2].

Ды ён стаяў. Глядзеў. «Пры чым тут гляд?..»

— Якая вы добрая...

— Добра?.. Нэ... — Яе нібыта штосьці азарыла. А ўсё ж вельмі проста, хоць з небывалай, здаецца, усмешкай, ціха сказала: — Вждыць йсэм пшэце йеном чэшка!..[3]

— Дазвольце, я... пацалую вам руку. Ну, як сястры...

— Руку? Нэні тшэба...[4]

А ўсё ж падала яе, моцную і пяшчотную, мусіць, не верачы, што ён сапраўды пацалуе. Калі ж ён трохі схіліўся, больш — падняў яе руку і, ледзь не ўсхліпнуўшы, адчуў пад губамі, кончыкам носа і падбародкам жывыя клавішы яе дрыготка-цёплых касцяшак, яна разгублена патупілася. Пасля, пры дапамозе яго рук, узняла заліты румянцам твар, слёзным бляскам вачэй засвяціла ў душу і, усемагутна абяссілеўшы, дала яму разгублена раскрытыя і... божа мой, як жа саподкія, родныя губы...

— Ах, к чэму то?... Цо то дэламэ!.. — шапнула пасля, перавёўшы дыханне. — Ох, нэ... Віцэ уж нэ... То йе вшэ... Мусітэ уж йіт. Я зуставам... Властнэ нэ, — мусім такэ... Розлоўчытсэ з німі[5].

Чатыры крокі — ад буфета да дзвярэй — а колькі сілы, мужнасці трэба, каб адарвацца і пайсці, адчыніць, паказацца на хітрыя вочы сяброў, асабліва Андрэя!.. Мужчына ты ці не? Глядзі вось... Ах ты, жаночая сіла!..

Слечна Іржыка махнула з ілба небяспечна апушчаны локан, прыплюшчыла вочы і закруціла галоўкай. Тады зірнула на яго ўжо іхнім, толькі іхнім і зноў усемагутна нявінным, нават наіўным позіркам і, нібы сказаўшы: «За мною!» — пайшла да парога першая.

* * *

— І навошта яны ва ўсім свеце такія харошыя?!

Андрэй не адказаў, маўчаў. Яны сядзелі ўдвух, і маўчанне здалося Алесю ад гэтага нібы цяжэйшым.

— А ўсё-такі скажы, што ў вас было там з Іржыкай,— чаго вы абое такія чырвоныя выйшлі? — спытаў, нарэшце, Мазалёк.

Гарачая сумесь пачуццяў — і няёмкасць, і гордае, патаемнае шчасце — зноў зашумела ў Алесевай галаве. Ажно заплюшчыўся, як быццам летучы на лыжах з высокай, снежна-сонечнай гары.

— Ты думаеш, я ведаю, што там было? Сам не магу разабрацца — было не было?..

Малы хмыкнуў з ледзь прыкметнай горыччу ці нават злосцю.

— Ты мне свае храновіны паэтычнай не гарадзі. Так толькі дзеўкі гавораць, калі пападуцца: «Не памятаю нічога...» Што ж тады памятае яна, як не гэта?

— А я не памятаю ўсё-такі. Проста — мара мая ці што?.. Што тут будзеш хваліцца....

— Ну, добра,— зноў пасля паўзы сказаў Мазалёк.— Аблізвайся, як кот, што нашкодзіў на кухні, адзін. Ты думаеш, што я ад зайздрасці? Калі пайшло на тое, дык яна мне напомніла... Ну, яшчэ не такую!.. Росны ранак, імгла ў даліне, а мы ідзем. Яна мяне праводзіла, каб не наткнуўся на «фінансаў». Так яны, чэхі, называюць славацкіх пагранічнікаў. І наогул смяюцца з усёй гэтай «незалежнай» Славакіі, з яе нядошлым фашызмам. Адзін дзядзька... ну, «сэдляк» чэшскі, з якім я сустрэўся, ужо недалёка ад Яблуноўскага перавала, позна вечарам, казаў мне многа. «Кдыж сэ Словенско мобілізуе, Мадзярско сэ затрэпе!..»[6] І рагоча... Ды штосьці я табе блытаю... Як уцякаюць — ведаеш і сам. Я ўцякаў трошкі інакш. Адзін махіндрала з каманды. З-пад Мосбурга. Тыдзень ішоў па Баварыі. Начамі, як і ты. Ну, а ў Чэхію ўвайшоў — проста як дома. Увечары песні па вёсках чуваць — у адной, у другой... І я, здаецца, не з палону іду, а пад Азёрамі дзе-небудзь ці пад Індурай, як у падполлі. А гавораць яны — сам жа ты чуў — як дзеці малыя, нібы песцячыся, так міла. Які, браце, край! Якія людзі!.. А я, хамут, украў на хутары «колё», веласіпед па-іхняму, і паехаў, як пан, і ўдзень. Бо я ў цывільным быў, нават і капялюш набакір, маць яго сена не ела!.. Каля таго Яблуноўскага перавала — стык трох граніц: Багемія-Маравія, генералгубернатарства Польшча і тая самая «свабодная» Славакія. «Там сі дайтэ позор![7] — сказаў мне той вясёлы дзядзька.— Зловяць фінансы, дык будуць плакаць, чаго добрага, што не хочацца немцам цябе аддаваць, а ўсё ж, вядома, аддадуць!..» Дарога мая тым часам, яшчэ завідна, пайшла ўгару, і колё прыйшлося пакінуць. Іду, брат,— горы, зара патухае, туман у даліне, аўсянае іржышча ля дарогі, смыркі[8] стаяць. І раптам — хутарок. Пастукаў і зайшоў. Гаспадыня, мусіць,—удава, сын нейкі ціхі, Вацлаў, і дзве дачкі, Вераніка і Агнешка. Людзі, браце,— паўбохана сітніцы, збан малака. Жару і брыдка: от дарваўся... Кажу, што ўнізе, пад гарою, колё. Вераніка пабегла і прывяла. Не ведалі, як дзякаваць, а мне няёмка, але не прызнаюся... А ўсё ж уранні і плату прыняў за гэты падарунак крадзены: другую палавіну бохана, каўбасу. Ды што там — плата: яны і так далі б. Найшла ўвечары поўная хата суседскіх дзяўчат, з другіх хутароў, шчабечуць, як дзеці: а гэта як па-нямецку, па-руску?.. Сяджу, брат, як герой! Спаць палажылі з Вацлавам. А мне — хоць ты згары — не спіцца: эх, і падзякую ж я вам, эх, і падсуну беленькіх!.. Уранні Вацлаў пайшоў на работу, а правесці мяне ўзялася меншая, Агнешка. Сонца ўзышло за гарамі. А маці просіць: «Нэходзь, дцэрко, сполу з панічэм, але пшэд нэбо за нім»[9]. Дзяўчынка светлая, семнаццаць толькі. Ды хіба ж я табе апішу?.. Ішлі мы побач, потым нават за рукі ўзяліся. Можа, таму і на «фінансаў» напароліся. Пачуўшы «гальт», я шыбануў, вядома, уцякаць. А яна абхапіла мяне... Здохну, браток, не забудуся!.. Абхапіла і просіць: «Ондраш, нэні тшэба!.. Он стшы-

---

[1] Хадзем, калі ласка, сюды.

[2] Вы, вядома, галодныя. Толькі ешце далей адгэтуль. А цяпер развітаемся і з вашымі сябрамі.

[3] Добрая? Не... я ж усё-такі чэшка!

[4] Руку? Не трэба...

[5] Ах, навошта гэта?.. Што мы робім?.. Ох, не... Больш ужо не... Гэта ўсё... Вы павінны ўжо ісці. Я застануся. Або не — і я таксама. Развітацца з імі.

[6] Калі Славакія мабілізуецца, дык Венгрыя задрыжыць.

[7] «Там будзьце ўважлівыя!»

[8] Яліны.

[9] «Не ідзі, дачушка, разам з панічом, але спераду або ззаду».



лі! Відзь!»[1] Гляджу: жандар узняў карабін... А я падняў рукі. На фронце, пад Варшавай, калі нас бралі, не паднімаў, а тут... і ўпёрся, вядома, што не ведаю гэтую гольку[2], што недалёка тут сустрэў яе, выпадкова. А яна толькі плача. З «фінансамі»— яны маўчалі, таўкачы, — адзін жандар, відаць, судэцкі немец. Бо ўсё крычаў на Агнешку: «Мылч, нэбо достанэш пар фацэк! Мылчэт!..»[3] Павялі нас назад міма хутара. Мне — адно. А яна толькі плача: «Я за ніц нэмужу!..[4] І усё. Маці здалёк яшчэ ўбачыла. «Дцэр-ка!» Як яны плакалі, бедныя!.. Маці і дочкі. Праваліцца б мне лепш праз зямлю... Яшчэ і махалі мы з ёю рукамі, як дзеці, узяўшыся. Калі ішлі туды, дзе сонца за гарой. Калі гаварылі, што я вось пайду і прайду, і напішу ёй, вядома... Застаўся, браце, толькі плач яе. Ды ў руцэ яшчэ цёпла: здаецца, яшчэ ўсё ідзем. Пайшлі, Алесь, ну яго к чорту ўсё!..

Усталі з лаўкі і памалу, лена шкрэбаючы па жвіры чаравікамі на салдацкіх цвіках, пайшлі ў духмянай засені ў свой бок.

— У Фрыдкаве яе пратрымалі два тыдні,— гаварыў на хаду Андрэй. — Мне што — у камеры не горш было, як потым у штрафкампаніі. Нават лепш. А яна?.. Куды яе загналі?.. Убачыў сёння гэтую — нібы сястра...

«Ах, к чэму то?.. Цо то дэламэ?..»

З тым самым хмельным сорамам і гордасцю Алесь успомніў свой нечаканы, неверагодны цуд. Было яно і сапраўды ці не было?.. Ну як жа не было, калі на вуснах яшчэ — хоць закрывайся — гарäць яе губы, пальцы яе — пад тваімі губамі. І вочы...

«Мілая слечна, няўжо ж гэта ўсё — мімалётнае? Няўжо гэта было, а не ўявілася, калі я выйшаў?..»

— Яна прыгожая была?— спытаўся ён у Мазалька, каб не маўчаць так доўга. І спытаўся — адразу адчуў — не па-свойму, а нейкім халодным, бяздарным пытаннем.

І малы пакараў яго мудрым спакоем незахмялелага:

— Вельмі прыгожая. Як кожны... ну, сапраўдны чалавек...

Пасля апусціўся з вышыні:

— Такая рань была. Яшчэ прыцемак нават. Ды дурань я,— я яшчэ ўвечар бачыў яе. Я і заснуць не мог пасля. Такая... Ну, перш за ўсё... А можа нават і на гэтую падобная, што ты... Як сабе хочаш, а справа не ў прыгажосці.

* * *

«У чым жа справа тады? — думаў пазней, ужо ў пасцелі, Алесь.— Чаму гэта ідзе яна са мной, як і з кожным, вядома, ледзь не ад самага нараджэння? Яна — ні з чым не параўнаная ў сваёй хвалюючай красе, непераможна вечная, хоць нібы часам і простая таямніца жыцця!..»

Пяцігадовым хлопчыкам ён бываў вельмі рад, калі да іх зімой прыязджала Мальвіна, сястра, такая старэйшая, што ён ўсё памыляўся і называў яе цёцяй. Прыязджала яна з кудзеляй і прывозіла з сабой двухгадовую Волечку.

Гэта нельга акрэсліць такімі звычайнымі, сухімі словамі — «ён бываў вельмі рад». Мальвіна з'яўлялася да іх часцей за ўсё, як і належыцца вялікай радасці, нечакана. То на сваім кані, то падвязе хто-небудзь. Як на сваім, дык на двор уязджае, вароты бягуць адчыняць... А на чужым — нехта той, што падвёз, спыніцца перад хатай на вуліцы і ўжо Мальвіна не прыязджае да іх, а прыходзіць. І малы, з падлогі ды праз замёрзлыя вокны, не вельмі і здагадаешся, што гэта яна. Толькі як стукне ў сенцах клямкай, зашалпочацца: «Ну хоць бы ўжо хто адчыніў!..» ды пакажацца ў дзвярах адразу з прасніцай ды з Волечкай — вось тады пачынаецца!..

Госцейку ставяць, «як ступу», на лаву і пачынаюць расхутваць. Бо яна так укручана ў вялізную хустку, што толькі чорныя вочы глядзяць праз шчыліну. Расхутаўшы, Мальвіна выцірае Волечцы нос, смачна цалуе яе ў чырвоную шчочку і ставіць на падлогу.

— Ідзі да дзядзькі Алеся, гуляйце.

А дзядзька той завіхаецца! Ох, як смяецца, ледзь не заплача ад радасці, ад нястрымнай, салодкай любасці да гэтых самых, толькі што цалаваных шчок, да вочак, што ўжо таксама



смяюцца, да пальчыкаў, што ўладна, цёпленька працягваюцца па тое, што Алесь ёй напэўна дасць. Бо ён багаты! І ён аддасць ёй усё, — і тыя шышкі-таўкачыкі, што тата прывёз яму з лесу, і тыя, што ён сёння прывязе; і калодзеж з паленцаў, якіх яму таксама тата настругаў; і чатыры шпулькі; і кніжку з цацкамі; і іхняга ката... А Толя іхні ў школу пайшоў, і гэта вельмі добра,— яны будуць толькі ўдваіх!..

Дзень праходзіў так хутка,— як быццам яны і не гулялі, і не абедалі разам, і не ляжалі з катом на печы...

Вось яе, госцейку, зноў ставяць на лаву, надзяваюць ёй паліто, завязваюць хустачку, потым хустку, тады накрываюць вялізнай цёплай хусткай, —так, каб захутаць усю. Ды Волечка пішчыць з-пад хустак, не даецца.

— Ну што? Ну што? Ах ты, божа мой, я й забылася!.. Давайце ўжо, калі так, зноў памяняйцеся сэплямі. Хадзі, кавалер, сюды!

Мальвініны дужыя рукі паднімалі Алеся на лаву, і ён нагінаўся да цёплых настаўленых губак. Яна тымі губкамі нават і цмакне, і скажа: «Ах!..» А ён зачырванеецца, зноў да шчаслівага, слёзнага смеху.

— Дзядзька з пляменніцай, чаго ж вы, — гаворыць Мальвіна, нібы разважаючы яго, і пачынае ўсё закрываць — і губкі тыя, і шчокі, і нос. Адны чорныя вочы блішчаць праз шчыліну ў шэрай, цёплай і шорсткай ваўнянай хустцы.

І Алесь забываецца зноў, што мама яго Волечкі, што Мальвіна — сястра, і просіць:

— Цётачка-а, заўтра прыедзь!..

Потым, праз многа год, Волечка стала прыгожай дзяўчынай, дужай работніцай, спрытнай танцоркай, пявунняй і рагатухай з беленькімі, роўнымі зубамі. Была яна і сур'ёзная, не дурная, і кніжкі любіла і бывала на іхніх спектаклях.

Іншую Волечку, чым якой яна вырасла не без іхняга з Толем уплыву, Алесь, вядома, не любіў бы.

Як гэта так — любіў?..

Гэта і дзіўна было, і пакутліва, і прыгожа.

Дружыць з пляменніцай, якой вось ужо і семнаццаць гадоў, ва ўсёй паставе якое, і ў рухах, і ў смеху так многа стала — адкуль і ўзялося!— прывабнага да здаровай няёмкасці, да зусім непатрэбнага яму хвалявання. Забыцца, што родная,—не забудзешся, а лічыць яе толькі пляменніцай, толькі сяброўкай з маленства — як быццам замала, ох, як шчаслівa і як не патрэбна замала. «Не, не яна! Вядома ж, дурань, не яна!»— цвяроза думаў ён, а ўсё ж паэтычна, да сумнай, узвышанай і глыбокай музыкі ў душы хваляваўся, калі абнімаў яе ў танцы, калі здымаўся з ёю на памятку дружбы, «шчака да шча-

---

[1] «Андрэй, не трэба! Ён стрэліць! Глядзі!»
[2] Дзяўчо.
[3] «Маўчы, бо дам па мардах! Маўчаць!..»
[4] «Я не вінавата!»

кі», як пакепліваў Толя. Смешна ўспомніць,— калі Алесь ішоў у войска, за некалькі дзён перад гэтым, а напярэдадні — найбольш не мог, зусім не мог спакойна думаць пра тое, што заўтра Волечка прыйдзе і яны пацалуюцца на развітанне... Яна спазнілася,— «з-за мамы ўсё», пісала яму пасля,— ён зазлаваў і паехаў. Што гэта — смешна ці брыдка? Не. Быў і трывожны гэты дур, і радасна было, калі яна знайшла свайго, пра што напісала нядаўна, сюды, у палон, наіўным ладам традыцыйнага пісьма («ва первых страках»), пахваліўшыся «міламу дзядзі і добраму другу Алесю» і мужам, і дачушкай...

...Алесь хадзіў на вячоркі і вечарынкі падлеткаў, вучыўся пад Макарцову скрыпку танцаваць, набыльваў, як гаварылі старэйшыя, на кавалера. Было і добра: ён быў сваім, і вясёлым, і дружным, і добра спяваў. Было часамі і сумна, хоць ты воўкам вый ад гэтага «набыльвання» з пустым хіхіканнем ды гыганнем, з гнілою лаянкай, з цемрай, перад якою ты бездапаможны.

Што да цемры, дык іхнія Пасынкі займалі па гэтым, бадай, самае першае месца ў ваколіцы.

Толя з Алесем адчулі адказнасць за гэтую цемру, за моладзь, якой не было каму памагчы.

У іхнім свеце наступіла тым часам і ажыўленне, якое прынёс «народны фронт». У вёску прыйшлі газеты «Наша воля» і польскі «Дзённік папулярны», на старонкі якіх пранікла свежасць усходняга ветру, а потым і гарачы подых баёў у Іспаніі. Над шэрай саломай стрэх пачалі спакваля ўздымацца радыёантэны. Пабольшала родных песень. Нават у Пасынках пачаліся самадзейныя спектаклі.

Найбольш турботаў прынёс Алесю яго апошні перад арміяй спектакль, у лютым трыццаць дзевятага года.

Ставіць абы што ён не хацеў. Лепшыя беларускія падцэнзурныя п'есы былі ўжо за два гады перастаўлены. Алесь пераклаў гогалеўскую «Жаніцьбу», перапісаў лацініцай і паслаў павятоваму рэферэнту бяспекі. Дазвол на пастаноўку далі адтуль неахвотна, як заўсёды, цераз бліжэйшы пастарунак, дзе меншага Руневіча і двух яго сяброў памарочылі трохі распытваннем і адкрыта бяздарнымі кепікамі. Улетку спектаклі ставілі звычайна ў гумнах, зімой — у школе. А тут настаўніца чамусьці не дазволіла. Нанялі ў мястэчку на вечар «людовы дом». На́ табе іншае — папа рымскі памёр: жалоба. Праз тыдзень, яшчэ ўсё з жалю па ім, як смяяліся горка сябры, паліцыя, па званку таго самага рэферэнта бяспекі, зняла ранейшы дазвол з «Жаніцьбы», прычым сказала з выразнай палёгкай, што і наогул усе імпрэзы на «мове тутэйшай» у далейшым забараняюцца: «прыгранічная зона»... Другая п'еса, падрыхтаваная імі да пастаноўкі, была польская: апошнім часам такое стала абавязковым. Заказырыцца і, у знак законнага пратэсту, не ставіць і гэтую — Алесь не захацеў. П'еса, «Майстар і чаляднік» Кажанёўскага, была цікавая, а ўпарты пасынкаўскі завадатар лічыў сябе ні больш ні менш, а грамадзянінам свету, свабодным ад нацыянальнай абмежаванасці... Ды ўсё ўжо, зрэшты, было гатова, а ў вёсцы за Нёманам — абзадачана самая лепшая ў наваколлі музыка.



Мала бяды, дык трэба ж яшчэ, каб якраз у тую нядзелю пайшоў на Нёмане лёд. Прыйшлося ў пажарным парадку шукаць другіх музыкаў...

Ад гэтага спектакль спазніўся, і самая лепшая з мястачковых прыгажунь, Зіна Чачотка, падтрыманая рогатам сяброўак і сяброў, паспрабавала — на ганку «людовага дома» — павастрыць свой язычок на горы меншага Руневіча, і без таго развінчанага ўшчэнт. Ён, праўда, не з без'языкіх, парагатаў з імі разам, аднак і злосны быў на тую «чачотачку» — да самага прыезду збавіцеляў, новых музыкаў.

Як ён іграў тады, у галоўнай ролі, п'яніцы-майстра! Як свяціліся ў будцы, ад нараджэння хітраватыя, вочы суфлёра Толі! А якія танцы былі пасля, як здорава — можа не горш за тых, занёманскіх, — ігралі незнаёмы гарманіст, скрыпач, худы, натхнёны дзядзька за цымбаламі і віртуоз, «не хлопец, а золата» — вельмі ж рухавы, вусаценькі барабаншчык!..

Калі яму ў танцы прыйшлася тая «чачотачка» (прызнацца трэба — вострая такі на язычок), Алесь, і сам, як цымбаліст, натхнёны цяжка здабытым поспехам, адчуў, што злосці ўжо даўно няма, што Зіна гэтая — дзяўчына і сапраўды на ўсё мястэчка. Больш!.. Стройная, спрытная, лёгкая ў танцы, яна і гаварыла, і смяялася, і маўчала так хораша... Добра на свеце!.. Нядаўні пасынкаўскі п'яніца і грубіян, галасісты Васіль Санюта стаіць на табурэце пад электрычнай лямпачкай, на здаравенных грудзях яго красуецца чырвоны бант дырыжора танцаў, а голас, ачышчаны намаганнямі калектыву ад «матавасці», гучыць так задорна, так весела і тактоўна. А як задуменна вальсуе Хвеськава Жэня, якую яму, Алесю, давялося навучыць чытаць, раней чым стала дзяўчына найлепшай у вёсцы артысткай. Ну, ужо і найлепшай?.. Не адна ж яна паказала і сёння, што могуць «цёмныя Пасынкі»!.. Колькі ў нас памагатых! Хто лепш загрыміруе цябе — хочаш на чорта, хочаш на бога — як не Косцік Вярбіцкі? А бачыш — кружыцца сабе, як быццам толькі ланьскі госць і не больш. Шмат і проста сімпатыкаў, таксама з іншых вёсак. Вунь як вывінчвае ў пары з «дзядзем Толем» Волечка, як усміхаецца з-за яго пляча, калі ёй падміргне «малодшы дзядзя»! «І кол-ла! — грыміць Васіль.— І бар-рышні злева!..» Добра на свеце! Хоць папа рымскі і памёр. Хоць час такі, калі падумаеш, шалёны, змрочны... Асабліва, калі табе — дваццаць другі, калі талкова рэпіць музыка, калі ў руках тваіх... І праўда ж — Зіна — «чачотачка» — прыгажуня!..

Нечаканасць — магутны фактар. Вальс нечакана закончыўся так, што Алесю прыйшлося падзякаваць Зіне. Ну, не вахлак жа ён — выйшлі на ганак. А там — нікога няма і цёмна. Яна сказала шчыра, стомлена, шчаслівa:

— Як добра сёння, праўда?

А ён, нібыта ў знак абсалютнай згоды, зусім нечакана прыгарнуў яе да сябе і першы раз у жыцці адчуў пад вуснамі губы дзяўчыны — маленькія, гарачыя — не адарвацца. Яны пацалаваліся яшчэ раз, моўчкі і вельмі ахвотна, а потым на ганак пасыпалі, відаць, таксама шукаючы адзіноты, іншыя пары. Потым зноў былі танцы... Ну так, у яе быў, вядома ж, кавалер, амаль жаніх, і ён непрыкметна павёў яе з танцаў...

Праз тыдні два Алесь пайшоў у войска. Была крыўда і злосць, і разлука з усім сваім родным светам, а вось разлукі з Зіначкай — не адчуваў. Нават і пацалункі, хоць памятае іх і сёння, здаваліся часамі і нечым зусім неверагодным. Вядомае і даўняе паняцце: «Проста не верыцца, што яно і было» — ён адчуваў тады вельмі жыва.

Так вось, як і цяпер, з другім у жыцці пацалункам, ды — божа мой! — з такою дзяўчынай і так нечакана!..

І навошта яны ва ўсім свеце такія харошыя?..

— Ты спіш? — спытаўся ён, у прыцемку шукаючы вачыма сябраў твар.

— Не спіцца, чорт яго...— прагудзеў Мазалёк.

Ах, як жа хочацца пагаварыць пра шчасце, якім яны абдзелены па волі гэтай суровай, дзікай вайны, пра шчасце, што прыйдзе калісьці, што ходзіць недзе, здаецца, так блізка!..

— Андрэй, ты ведаеш, я не ілгу. Дальбог жа ў мяне адчуванне такое: было што, не было?.. Як казка, як нейкая музыка, чорт яе ўзяў бы. Проста не верыцца і ўсё.

Дружба дружбай, а шчасце бывае сляпое, глухое, неразумнае. Толькі пасля, праз некалькі тыдняў, працверазеўшы ад новых падзей, Алесь паміж іншым успомніць гэта і зразумее. А цяпер яму нават пачулася штосьці накшталт маладой, няхай сабе нават міжвольнай, а ўсё ж-такі рэўнасці ў словах:

— Дык і добра, што ж ты...— А пасля паўзы:— І няўжо нам з табою трэба тут думаць толькі пра гэта?..

# СЯСТРА БАСЫСА

*Пошта прыносіць нам пісьмы. Іх многа, адусюль і аб усім. Бярэш у рукі складзены лісток і бачыш за ім лёс чалавека. Чытаеш і верыш, хочацца верыць кожнаму радку, кожнаму слову, прысланаму ў рэдакцыю.*
*Але ж бывае і так...*

Перада мною ляжыць пісьмо, тваё пісьмо, Люба. Ты просіш памагчы табе. Ты апісала сваё жыццё, апісала так, што нельга было не кінуцца за цябе ў бой. Адразу, з першай мінуты я рашыла: трэба зрабіць усё, каб дабіцца для цябе і асобнага пакоя, і кругласутачных ясляў для тваёй Ірынкі. Зрабіць усё, каб вы былі разам.

Праўда, крыху здзівіла прыпіска: «...Калі ў бліжэйшы час гэтыя пытанні не будуць вырашаны, я, каб быць разам з дачушкай, у адчаі прыму прапанову бацькі маёй Ірынкі, якому зараз 61 год і які згвалціў мяне, калі я была дзяўчынкай...»

...І вось мы сядзім з табой у лесе ля завода.

Некалькі дзён ты не ходзіш на працу. У цябе забінтаваны палец. Гэтым пальцам ты спрытна скідаеш мурашак, калі яны, спяшаючыся скараціць свой шлях да мурашніка, імкнуцца прапаўзці цераз коўдру. Ты расказваеш пра сябе, расказваеш спакойна, прывычна.

Нарадзілася ў 1944 годзе ў Растове-на Доне. Маці памерла. Бацька не вярнуўся з вайны. Жыла з бабуляй. Вандравалі па свеце, потым асталяваліся ў Мінску. У 1957 годзе не стала і бабулі. Табе трынаццаць гадоў, і ў цябе няма грошай плаціць за прыватную кватэру, дзе вы жылі. Начуеш у сяброўкі ў інтэрнаце падшыпнікавага завода. Ты чакаеш яе ля прахадной завода, каб разам ісці ў інтэрнат. Часта чакаеш да дванаццаці... Аднойчы з табою загаварыў вартаўнік, стары чалавек, гадамі твой дзед... Ты стала яго служанкай.

А потым... Потым ты ўцякла ад яго, пакінуўшы там усё... Зноў жыла ў чужых людзей, пакуль цябе не прыгрэлі баптысты. І ты пачала наведваць сходы секты. Цябе ахрысцілі. Далі біблію, псалтыр. Назвалі цябе «сястра Басыса». У час чарговага малення табе паказалі «сястру», якая, каб загладзіць свае грахі, ахвяравала богу сваю дачку. Чаму яны табе пра гэта расказвалі? Можа таму, што ў цябе таксама ёсць дачка?

У секту трэба плаціць узносы. Ты стала працаваць на заводзе. Твая зарплата— 60 рублёў. Аднойчы ты ля прахадной страціла прытомнасць. Сказала, што ад голаду, бо ўсе грошы ішлі баптыстам.

Цябе ўладкавалі ў заводскі інтэрнат. Цэх, дзе ты працавала, і заўком памаглі грашыма. Ты атрымлівала бясплатныя абеды ў сталоўцы. Цяжка табе было працаваць у цеплаcілавым цэху — цябе назначылі электрыкам, хоць у электрычнасці ты нічога не разумела, потым перавялі цябе ў аддзел тэхнічнага кантролю, дзе ты і цяпер працуеш кантралёрам.

Камсамольцы памаглі табе парваць з сектай.

Расказала ты мне, што сектанты-трасуны ўгаварвалі цябе вярнуцца. Ты разумееш чаму — ты надта многа ведала, і гэта было для іх небяспечна. Але аднойчы ты зноў прыйшла да іх, і цябе ледзь не распялі на крыжы.

Выратавалі дружыннікі. Тры дні яны шукалі цябе і знайшлі.

Месяц ты ляжала ў бальніцы, потым месяц лячылася ў заводскім санаторыі.

На гэтым можна было і скончыць тваю гісторыю. Больш ты мне нічога не расказала. Астатняе расказалі людзі...

Ты пішаш у рэдакцыю: «...нікому не дадзена двойчы пражыць жыццё. І гора таму, хто хавае свае памылкі, стараючыся забыць пра іх. Не, не забывай пра іх, а расказваць, не даваць іншым рабіць

# ЭКРАН



Кадр з кінафільма «Знаёмцеся, Балуеў!»

З вялікай цікавасцю прагледзіце вы новую мастацкую кінакарціну «Знаёмцеся, Балуеў!», створаную рэжысёрам Віктарам Камісаржэўскім на студыі «Ленфільм» па матывах аднайменнай аповесці Вадзіма Кажэўнікава.

У аснове карціны — гісторыя ажыццяўлення смелай задумы: весці лінію газапровода не ў абход, а напрасткі, праз гнілое балота. Але гэта не «вытворчы» фільм таго тыпу, які быў так распаўсюджаны дзесяць — пятнаццаць год назад. Не пра будаўніцтва, а пра людзей, якія будуюць, расказвае ён. Кожны паказаны ў ім чалавек — цікавая асоба. У кожнага — свой лёс, свой асаблівы духоўны свет. Іх думкі і пачуцці, падзеі, якія адбываюцца з імі, даюць глебу для разважанняў аб прыродзе працы — працы творчай; для роздуму аб жыцці.

У ролі Балуева здымаўся папулярны кінаакцёр Іван



Кадр з кінафільма «Каралеўства крывых люстэркаў».

Пераверзеў. Цікавы вобраз яго жонкі Еўдакіі стварыла актрыса Ніна Ургант.

...Запоўнены трыбуны Палаца спорту ЦСКА. На ледзяной арэне выступаюць фігурысты. Зусім маленькая дзяўчынка плаўна і лёгка выконвае пад музыку даволі складаныя фігуры. Публіка апладзіруе кожнаму эфектнаму пірузту. Суддзі высока ацэньваюць выступленне юнай фігурысткі.

Але што гэта? Чаму на трыбунах шум? Што за гора-фігурыст выехаў на лёд? Ледзь трымаючыся на нагах, сагнуўшыся ў тры пагібелі, ён перасякае поле і, наткнуўшыся на бар'ер, падае. Выбух смеху на трыбунах...

Мы расказалі эпізод з новай кінакамедыі «Штрафны ўдар», пастаноўку якой ажыццявіў на Маскоўскай кінастудыі імя М. Горкага рэжысёр В. Дорман па сцэнарыю вядомых паэтаў-сатырыкаў В. Бахнова і Я. Касцюкоўскага.

У галоўных ролях заняты артысты М. Пугаўкін,

такія ж памылкі. Бо вельмі дарагой цаной плаціць чалавек за тое, каб навучыцца разумець памылкі».

Ты пісала гэтыя словы, маючы на ўвазе толькі адну сваю памылку ў жыцці — сувязь з баптыстамі. Але ж цяпер, калі я ведаю пра цябе ўсё, я лічу, што гэта была не памылка, а добра абдуманы крок, якім можна потым спекуляваць. Ты і спекулюеш гэтым амаль два гады.

На заводзе ты расказвала сваю гісторыю інакш. Ты гаварыла, трагедыя твая пачалася ў секце. Ёсць там такі дзень, дзень збліжэння братоў і сясцёр, яго праводзяць сектанты некалькі разоў у год, прыўрочваючы да любога рэлігійнага свята. У гэты дзень збіраецца ўся абшчына і займаецца, проста кажучы, распустай. Тут не глядзяць, бацька або дачка, маці або сын, малая або дзед...

У часе такога збліжэння і ты, яшчэ зусім дзяўчынка, стала жанчынай... Пра гэта ты пісала і ў сваім пісьме ў рэдакцыю: «...Мяне прымусілі старанна маліцца богу... Потым забаранілі наведваць тэатры, кіно, чытаць кнігі, газеты, часопісы. Ішоў час. І тут зноў навалілася гора. Як ні дзіўна, але я стала жанчынай, а ў хуткім часе і маці. У мяне нарадзілася дачка...»

Расказваючы пра гэта, ты была ўпэўнена, што цябе пашкадуюць. Разлік быў дакладны, цябе шкадавалі. Ішлі табе насустрач. Памагалі хто чым мог. А як жа інакш? Дзяўчынка трапіла ў рукі павукоў-сектантаў. Яны збэсцілі яе душу. Знішчылі ў ёй усё чалавечае: сумленне, гонар, чалавечую годнасць. Яны набілі ёй галаву мараллю: грашы колькі хочаш, а потым памаліся богу, і ён даруе табе.

Вось па такой маралі ты жыла. Хаця добра разумела, што гэта мараль не наша, не савецкая, не чалавечая.

Як жа было цябе не вырваць з павуціння, якім ты была аблытана? І кожны, каму ты расказвала сваю гісторыю, стараўся памагчы табе стаць чалавекам.

Але ж ты нікому не расказваеш сваёй сапраўднай біяграфіі. За цябе раскажу я.

Нарадзілася ты не ў 1944 годзе, а ў 1941 (потым падрабіла пашпарт). У 1948 годзе пайшла ў школу, у першы клас. Вучылася дрэнна. Па два гады сядзела ў адным класе, ледзь закончыла шэсць і са жніўня 1958 года пайшла працаваць на базу, паліла там у печы. Ты ўжо была не маленькая, табе было семнаццаць гадоў.

Але працаваць цяжка, а ты марыла матылём порхаць па жыцці, і ты пайшла ў нянькі, рашыла, што там лягчэй. Не спадабалася табе тваё імя — стала зваць сябе Люда, Люда Мацекіна, гучыць! Потым вецер прыгод закінуў цябе ў Калінінград, адтуль у Мінск. Тут ты трапіла да вартаўніка падшыпнікавага завода, які вось-вось павінен быў пайсці на пенсію. За чатыры месяцы, што ты ў яго пражыла, ён некалькі разоў прасіў цябе пайсці з яго дому, бо яму, старому чалавеку, надакучыла прачынацца ноччу ад рогату пад яго вокнамі і адчыняць табе пад раніцу дзверы.

Прыйшоўшы неяк з дзяжурства, ён убачыў, што ты перанесла свае рэчы ў пакой, які раней быў заняты сям'ёй кватаранта. Ты выжыла гэтых людзей.

— Я хачу жыць у асобным пакоі,— заявіла ты Петрашунасу,— буду плаціць, бо хутка атрымаю грошы па бюлетэню.

Навошта ж табе патрэбны быў асобны пакой? Для распусты і п'янак. Колькі б Петрашунас ні заходзіў да цябе, ён бачыў на стале, пад сталом пустыя бутэлькі з-пад гарэлкі і віна.

Ты пражыла ў яго чатыры месяцы, потым сышла зусім. Дзе ты жыла, што рабіла? Калі гаспадара не было дома, прыехала на машыне і забрала свае рэчы. А пасля яшчэ раз прыйшла да яго ў дом, але ўжо не адна — з дзіцем на руках. Можа ён і даў бы табе прытулак, калі б ты не заявіла адразу:

— Я хачу быць тут жонкай і гаспадыняй!

— У мяне ж ёсць жонка!

— Праганіце яе, я маладзейшая.

Прыйшлося паклікаць міліцыю. Ты памятаеш пра гэта?

Не расказваеш ты нікому, што потым выйшла замуж за чалавека, які да цябе ставіўся высакародна: ён удачарыў Ірынку. А як ты аддзякавала яму? Закончыўшы работу ў чатыры гадзіны, ты прыходзіла дадому пасля дванаццаці... Ён прагнаў цябе.

Аднойчы, у час выпадковай сустрэчы з Петрашунасам, ты сказала яму са смехам, што стала баптысткай.

— Ты звар'яцела,— сказаў стары.

— У мяне многа грахоў, я хачу замаліць іх.

Гэтая размова была летам 1961 года, якраз тады, калі здарылася яшчэ адна брудная гісторыя. І пра яе раскажу, хоць гэта агідна.

Дом груднога дзіцяці, дзе знаходзілася твая Ірынка, летам выязджае на дачу ў Ждановічы. Ты наведала яе, тады яшчэ шасцімесячную, пазнаёмілася з нейкім фатографам, пайшла з ім у лес і фатаграфавалася ў такіх позах, што мусілі судзіць і цябе і «майстра»...

Табе не напомнілі б пра гэту гісторыю, каб ты пасля не нарабіла зноў «памылак». Ты цэлымі тыднямі не ходзіш на працу, не начуеш у інтэрнаце, гаворыш, што цябе праследуюць баптысты. Дружыннікі завода ўзялі цябе пад нябачную ахову. Яны сачылі за кожным тваім крокам. І твае словы аказаліся хлуснёй.

Два гады ты жывеш без праіскі: кажаш, згубіла пашпарт. А новы атрымаць не хочаш... Ведаеш: за падробку дакументаў таксама судзяць.

Ты крадзеш. У інтэрнаце цябе злавілі, і да гэтага часу, ужо некалькі месяцаў, не могуць рашыць, што зрабіць з украдзенымі табою рэчамі, бо шкадуюць цябе, бо ў інтэрнаце закон: за кражу высяляюць.

Мне здаецца, што з табою ўсе занадта нянчацца: і завод, дзе ты працуеш (калі ў цябе ёсць «адпаведны настрой»!), і камсамол, і прафсаюзная арганізацыя, і інтэрнат. І толькі камендант інтэрната,

## ЭКРАН

В. Трашчалаў, Л. Алешнікава, І. Пушкароў.

Жывую цікавасць выкліча ў гледачоў і новая кінааповесць «Трое сутак пасля бяссмерця», створаная двума калектывамі ўкраінскіх кінематаграфістаў — кінастудыяй імя А. П. Даўжэнкі і Ялцінскай студыяй. Аўтар сцэнарыя — К. Кудзіеўскі, рэжысёр пастаноўшчык — В. Даўгань.

Фільм «Трое сутак пасля бяссмерця» прысвечан аднаму з самых вострых момантаў у гісторыі абароны Севастопаля: камандаванне загадала войскам эвакуіравацца, а група салдат і матросаў, адрэзаных у каменяломні, нічога пра гэта не ведае.

Прыемны падарунак чакае нашых юных гледачоў. Ім будзе паказана новая кіназказка «Каралеўства крывых люстэркаў» вытворчасці Маскоўскай кінастудыі імя М. Горкага. Аўтар сцэнарыя — Віталі Губараў, рэжысёр - пастаноўшчык — Аляксандр Роу.

У кастрычніку гледачы змогуць таксама прагледзець рад зарубежных мастацкіх кінакарцін, шмат новых хранікальна-дакументальных і навукова папулярных фільмаў.

Р. КАПЛЯ

Кадр з кінафільма «Штрафны ўдар».



Любоў Рыгораўна Карачун, бачыць тваё сапраўднае аблічча.

— Яе, дармаедку,— гаворыць яна,— трэба выселіць з Мінска, каб не зводзіла іншых....

Я згодна з ёю. Ты шкодны чалавек, бо працягваеш жыць па маралі «сястры Басысы»: «саграшу і пакаюся». Цябе бачаць на вуліцах горада, на возеры, дзе ты праводзіш дні ў кампаніі непаўналетніх. Чаму ты іх навучыш, нават страшна ўявіць.

А ты ж магла стаць чалавекам, колькі табе памагалі ў гэтым!

Завод, які акружыў цябе клопатамі і ўвагай, вядомы ва ўсім свеце. Трактары з ягонай маркай — першыя памочнікі земляроба і на Беларусі, і на палях пад Растовам, адкуль ты родам, яны славяць нашу краіну на свабодалюбівай Кубе, у В'етнаме, Афрыцы. А ці ёсць хоць у адным з іх доля тваёй працы? Няма, бо ты не ўмееш нічога рабіць і не хочаш вучыцца. Хочаш бесклапотна, бяздумна жыць на ўтрыманні грамадства, карыстаючыся яго дабротамі. Думаеш увесь свой век пракарміцца за кошт добразычлівых людзей, расказваючы ім завучаную казачку аб тваіх пакутах. А пры зручным выпадку не пагрэбуеш запусціць руку ў чужую кішэнь.

Больш дзвюх тысяч тваіх аднагодкаў— рабочых завода вучацца ў школах, тэхнікумах, інстытутах. Я табе казала пры сустрэчы: вучыся, тады ты станеш сапраўднай апорай для сваёй Ірынкі.

Ты мне адказвала, што на вучобу патрэбны гады, а ў цябе няма часу чакаць (!).

Чаму ў іншых ёсць, а ў цябе няма? Вазьмі прыклад са сваіх сяброўак па пакоі. Ты сама прасілася ў гэты пакой, лепшы ў інтэрнаце, гаварыла, што там, дзе ты жывеш, цябе не разумеюць. Ты ўжо год жывеш тут, а што добрае захацела пераняць ты ў іх? Што ты ўзяла ад сяброўак па пакоі? Акрамя розных іх дробных уласных рэчаў — нічога...

Лена Чырко (яе ложак стаіць побач з тваім)—сірата, была ў дзіцячым доме, скончыла рамеснае вучылішча, працуе ў прэсавым цэху слесарам-зборшчыкам, закончыла вячэрнюю дзесяцігодку і цяпер перайшла на другі курс вячэрняга аддзялення філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Леніна. Люда Хахлова — лінатыпістка друкарні — таксама студэнтка БДУ. У гэтых дзяўчат ёсць мэта ў жыцці, а калі ёсць мэта, у нашай краіне можна яе дабіцца.

А якая мэта ў цябе? Ты хочаш забраць дачку з дома груднога дзіцяці, дзе яна на поўным дзяржаўным забеспячэнні. Ты спасылаешся на свае мацярынскія пачуцці. Але ж, акрамя пачуццяў, ёсць яшчэ і абавязкі. Ты не справішся з імі. Ты ад жыцця толькі бярэш, нічога не даючы ўзамен. Так нельга! Ты патрабуеш асобны пакой. У цябе няма яшчэ права ні на асобны пакой, ні на дачку. Ты павінна заслужыць гэта права. Ты павінна перш за ўсё сама стаць чалавекам. І тады ў цябе будзе ўсё, і сябры, сапраўдныя, шчырыя, адданыя. У «сястры Басысы» іх ніколі не будзе!

**Галіна ВАСІЛЕЎСКАЯ**

Мінскі трактарны завод.

## НАМ ПІШУЦЬ

### КАНДУКТАР КАЦЯ КУЛЬГА

Камсамолка Кацярына Кульга — кандуктар аўтобуса Лепельскай аўтабазы № 14. Шмат добрых слоў пра Кацю скажуць вам на аўтабазе. Вадзіцелі аўтобусаў імкнуцца «завербаваць» Кацярыну Ягораўну да сябе ў аўтобус, бо ведаюць: працуючы з ёй, абавязкова перавыканаюць дзённае заданне. І пасажыры застануцца задаволены.

Асабліва часта Кацярыне Ягораўне даводзіцца працаваць на гарадскіх маршрутах № 1 і № 2. Усе прыпынкі аўтобус праходзіць строга па графіку, бо парушэнне яго прынясе шмат непрыемнасцей пасажырам.

Кацярына Ягораўна асабліва ўважлівая пры пасадцы пасажыраў, ветліва прапануе сесці пажылым і жанчынам з дзецьмі. Яна не толькі прадае білеты, але заўсёды растлумачвае, дзе якая вуліца і як прайсці ў тую ці іншую ўстанову. А то і дапаможа на прыпынку сысці бабулі.

**Г. БУЯЛЬСКІ,**
эканаміст аўтабазы № 14.



Ларыса Лукінічна Калеснікава.
Фота В. Хількевіча.

### ТУТ СМАЧНА ГАТУЮЦЬ

Магілёўскае двухгадовае вучылішча скончана. Цяпер Ларыса Калеснікава — повар II катэгорыі чавускай чайной № 1.

Неўзабаве ў чайной пачаліся перамены. Наведвальнікі адразу заўважылі: ежа стала смачнейшая, больш разнастайная. Ларыса гатавала і апетытныя ленінградскі расольнік, і наварысты боршч, і шашлык, і плоў.

У кнізе прапаноў адна за другой з'явіліся цёплыя і шчырыя словы падзякі маладому повару.

Зараз Ларыса Калеснікава змагаецца за званне ўдарніка камуністычнай працы. Думае яна і аб паступленні ў інстытут.

**В. ХІЛЬКЕВІЧ**



27 верасня спаўняецца 60 год з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза бясстрашнай партызанкі-падпольшчыцы Веры Харужай, якая шмат гадоў прабыла ў турмах панскай Польшчы.
На малюнку мастака В. Дайнэні вы бачыце Веру Захараўну за кратамі польскай турмы ў дзень Першага мая.

Пятрусь БРОЎКА

### *Бачу я ўсюды Веру Харужую...*

Шлях твой цяжкі быў, не ўсцелены ружамі,
Шлях твой суровы,
Вера Харужая!

Ды не прыстала нідзе ты, не збочыла,
Цераз віхуры, нястомная, крочыла...

І сёння іду я —
Горадам, вёскаю,
Голас твой чую ў сям'і камсамольскай,

Бачу цябе, маладую і дужую,
Бачу я ўсюды
Веру Харужую.

Песні і жарты, прамовы праменныя,
Там, дзе юнацтва,— яна незаменная.

Колькі ў ёй сілы, адданасці, любасці,
Бачу ў Палессі
Ля Прыпяці, Убарці —

Там, дзе да захаду траса кладзецца,
Тая, што «Дружбаю» шчыра завецца.

Верыла Вера,
Што гэта ўжо блізкае,
Бачу Харужую я камуністкаю.

Бачу ў змаганні з варожай навалаю,
Бачу яе партызанкай бывалаю.

Не, ты не знікла,
Хай чуткі і ўпартыя,
Бачу я Веру на полі, на трактары.

Бачу за працаю рупнай, шахцёрскай,
Між юнакоў на зямлі Салігорскай.

Не, не паверу,
Яна не загінула —
Вера бяссмертнай валодае сілаю.

Скрозь у народзе дужую, мужную,
Знойдзеце Веру,
Веру Харужую!

# ЦІ ПРЫРОДЖАНЫ ХАРАКТАР?

Гэтае пытанне хвалюе многіх: выхаваннем ствараецца характар чалавека ці ён перадаецца па спадчыне?

Некаторыя думаюць, што характар перадаецца дзецям па спадчыне ад бацькоў, бабуль, дзядуль, цётак. Жадаючы даказаць, што гэта сапраўды так, яны кажуць: «Чаму ж у адной і той жа сям'і, у адных і тых жа бацькоў вырастаюць дзеці з зусім рознымі характарамі? Выхоўваюць іх аднолькава. Значыць, адрозненні ў характарах тлумачацца спадчыннасцю: адзін удаўся ў тату, а другі — у маму або цётку.

Нядаўна я гутарыла з адной маці. Ірына Іванаўна не скардзілася на сына, яна проста прымірылася з яго жорсткасцю, прагнасцю і себелюбствам. Яна запэўняла мяне, што характар дзесяцігадовага хлопчыка — гэта характар дзядулі, мужавага бацькі. «Выліты дзед: замкнуты, эгаістычны і дэспатычны. Нічога з ім не зробіш, такі ўжо ўрадзіўся!».

Ці не памылілася Ірына Іванаўна? Так, памылілася! Больш таго, яе думка шкодная. Чаму? Таму, што расслабляе волю бацькоў і ўсяляе нявер'е ў сілу выхавання, заражае іх песімізмам.

У «Кнізе для бацькоў» А. С. Макаранка гаварыў, што ў практыцы свайго жыцця ён не ведаў ніводнага выпадку, калі б паўнацэнны характар узнік сам па сабе, без здаровай выхаваўчай абстаноўкі.

Ну, а што ж перадаецца па спадчыне, спытаеце вы?

Па спадчыне перадаецца не характар, а тып нервовай сістэмы, які з'яўляецца фізіялагічнай асновай характару, і гэта не трэба блытаць.

Калі вы былі назіральнымі, то яшчэ ў радзільным доме не маглі не заўважыць розніцы ў паводзінах здаровенькіх дзетак: адны крыклівыя, рухавыя, раздражняльныя і прыносяць шмат клопатаў і непрыемнасцей, а другія — спакойныя, павольныя, вялыя. Што гэта такое? А гэта атрыманыя ў спадчыну асаблівасці нервовай сістэмы дзіцяці, яны перадаюцца ад бацькоў гэтаксама, як рысы твару, форма цела, колер валасоў, асаблівасці сардэчнай і сасудзістай сістэмы.

Характар у дзіцяці пачынае фарміравацца вельмі рана. Вядома, на першым годзе, другім і нават трэцім поўнасцю характар не складваецца, але несумненна, што ў гэты перыяд ствараюцца яго асновы ў выглядзе звычак і ўменняў. Таму ў гэты перыяд асабліва вялікае ўздзеянне на характар дзіцяці маюць паводзіны бацькоў: іх адносіны да сваякоў і знаёмых, стаўленне да працоўных абавязкаў, да самых сябе, да рэчаў і прадметаў асабістых і грамадскіх. Калі дзіця бачыць, што бацькі ўважлівыя да людзей, чулыя, добрыя і справядлівыя, калі ў сям'і ўсе працуюць па меры сіл і здольнасцей і прывучаюць да гэтага малодшых, калі бацькі паказваюць прыклад прастаты, скромнасці, шчырасці і праўдзівасці, то і яно вырастае такое ж. Калі ж у прысутнасці дзяцей бацькі маняць, праяўляюць пагарду да грамадскіх інтарэсаў, эгаізм, себелюбства, дзеці ўспрымаюць такія паводзіны як жыццёвую норму і самі вырастаюць ілжывыя і грубыя, з дрэннымі звычкамі.

Але бывае і так: бацькі добрыя, сардэчныя людзі, а дзеці ў іх жорсткія, эгаістычныя, дрэнна адносяцца да бацькі і маці. Чым жа гэта тлумачыцца? Дэфектамі выхавання, і ў першую чаргу залішняй самаадданасцю бацькоў, празмернай сляпой любоўю: дзецям ні ў чым не адмаўляюць і нічога не патрабуюць ад іх. Бацькі абмяжоўваюць сябе ў самым неабходным — у адзенні, харчаванні, абы толькі задаволіць капрызы і жаданні дзяцей. Безразважны, паразітычны спосаб жыцця параджае легкадумнасць, эгаізм, жорсткасць. А ў празмерна ўладных, дэспатычных бацькоў сыны і дочкі іншы раз вырастаюць слабавольныя, несамастойныя, бездапаможныя. Чаму? Ды таму, што бацькі падаўляюць іх ініцыятыву, зневажаюць іх самастойнасць, падаўляюць дапытлівасць. За што б дзіця ні ўзялося, яго зараз жа спыняюць. Чым бы яно ні зацікавілася, яму адказваюць: «Паспееш! Падрасцеш — пазнаеш». І дзіця расце, але без агеньчыку ў душы, без гарачых імкненняў многае ведаць, многае зразумець, многаму навучыцца. Так узнікаюць рысы характару, процілеглыя рысам характару іх бацькоў.

Яшчэ адно пытанне. «Чаму ж у адной і той жа сям'і, у адных і тых жа бацькоў вырастаюць дзеці з рознымі характарамі?»

Давайце прааналізуем умовы жыцця дзіцяці ў сям'і. Хіба яны нязменныя, нават у такім маленькім калектыве, як сям'я? Напэўна, мяняецца бюджэт сям'і, жыллёвыя ўмовы. Прыязджалі і ад'язджалі родныя, жывуць і выбіраюцца кватаранты, адно дзіця расло з нянькай, другое — у дзіцячым садзе, трэцяе — доўгі час жыло ў вёсцы ў бабулі. А ўсе гэтыя акалічнасці ўздзейнічалі на фарміраванне характару і па-рознаму ўплывалі на дзяцей рознага ўзросту, рознага тыпу нервовай сістэмы.

Успомніце: а хіба вы, бацькі, аднолькава адносіліся да першага і другога дзіцяці або да самага малодшага, якое паявілася тады, калі першыя выраслі? Згадзіцеся, першынец у некаторых бацькоў доўга бывае адзіным пестуном, і над ім мама з татам «дрыжаць». Гэта не можа не ўплываць на фарміраванне характару. Але вось паяўляецца другое, і ад старэйшага «пестуна» бацькі патрабуюць уступкі маломý. Адносіны да яго рэзка мяняюцца. Першынец пратэстуе, «бунтуе», грубіць бацькам. Малодшы, у сваю чаргу, прывыкае пакрыху шукаць выгады і злоўжываць сваім становішчам. Так ствараюцца розныя рысы характару ў дзяцей адных і тых жа бацькоў.

Такім чынам, асаблівасці характару, таксама як і погляды, перакананні, культурныя навыкі і звычкі, складаюцца пад уплывам выхавання.

**В. ЖУКОЎСКАЯ,**
**кандыдат педагагічных навук.**

**Качаняты.**
Фотаэцюд М. Мінковіча.



## ГЭТА ТРЭБА ВЕДАЦЬ

Дзіця пайшло ў першы клас. Не забывайце, што поспехі малога залежаць і ад вас, бацькоў, ад таго, як вы яму дапаможаце арганізаваць сваю працу і адпачынак.

Уставаць трэба ў 7—7.30 раніцы, за гадзіну паўтары да пачатку заняткаў, тады маленькі школьнік паспее зрабіць ранішнюю зарадку і абціранне, прыбраць пасцель, не спяшаючыся паснедаць.

Пасля ўрокаў трэба паабедаць, аслабленым дзецям — паспаць, а потым пагуляць на двары, пабегаць, павесяліцца. Праз 2—2,5 гадзіны пасля вяртання са школы пара за ўрокі.

Вячэраць раіцца за гадзіну-паўтары да сну, затым — прагулка, вячэрні туалет.

Спаць першакласніку трэба 11—12 гадзін у суткі.

* * *

Дзяцей трэба класці спаць заўсёды ў адзін і той жа час: дашкольнікаў — не пазней 8 гадзін вечара, малодшых школьнікаў — не пазней 8 гадзін 30 мінут. Гэты парадак не павінен парушацца ніколі і ні па якой прычыне. Ці будні дзень, ці святочны, ці прыйшлі госці, ці адзначаецца дзень нараджэння — гадзіна дзіцячага сну павінна заставацца свяшчэннай і непарушнай

# УРАЧ РАІЦЬ



## ШТУЧНАЯ НЫРКА

Праз шкляныя дзверы аперацыйнай я стараюся разгледзець, як будуць замяняць хворую нырку штучнай. Але мне замінае цыліндрычны бак з паўпразрыстым кубам наверсе, які стаіць перад ложкам.

Вось урач ускрывае вену сцягна, устаўляе ў яе тонкую трубачку, затым робіць тое ж самае з венай локцевага згібу і націскае кнопку. У адзін момант ажывае гэты апарат, які замінаў мне бачыць. Бясколерны куб афарбоўваецца ў чырванаваты колер. Туды пачала паступаць кроў з вены хворага.

Няўжо іменна гэта і ёсць «штучная нырка»? Яна не падобна па свайму знешняму выгляду і размерах на натуральную.

Ныркі выконваюць у нашым арганізме вельмі важную ролю — фільтруюць кроў. Праз іх штодзённа праходзіць тысяча літраў крыві, ачышчаючыся ад шкодных рэчываў — адходаў акіслення і бялковага абмену. Калі нырка захварэе і выйдзе са строю, то адбудзецца самаатручэнне арганізма, і чалавек загіне.

Яшчэ паўстагоддзя назад вучоныя выказалі думку, што шлакі можна выдаліць з арганізма, фільтруючы кроў праз паўпранікальную мембрану. Аднак прыйшлося пераадолець мноства цяжкасцей, перш чым удалося стварыць апарат, які можа выконваць функцыі нырак.

Прынцып яго работы нескладаны. Помпа выштурхоўвае з вены сцягна кроў у дыялізатар — куб, умацаваны на накрыўцы бака. Ён складаецца з размешчаных паралельна плексігласавых пласцін з нацягнутымі на іх цэлафанавымі плёнкамі. Бак запоўнены солевым растворам, блізкім па свайму саставу да крыві чалавека.

Раствор нагнятаюць паралельна патоку крыві паміж дзвюх цэлафанавых плёнак. Дакранаючыся да іх, кроў аддае ядавітыя рэчывы ў солевы раствор.

Гэта адбываецца дзякуючы вядомаму фізічнаму закону — дыфузіі: рэчывы імкнуцца перайсці з раствору больш насычанага ў менш насычаны. Прайшоўшы праз складаныя калідоры дыялізатара, ачышчаная кроў вяртаецца ў вену локцевага згібу рукі хворага.

Сення аперыруюць дваццацісямігадовага чалябінскага шахцёра Барыса Х. Жыццю яго пагражае небяспека. Урачы выявілі ў крыві вялікую колькасць калію. Трэба тэрмінова ачысціць кроў. Самалёт, пераадолеўшы двухтысячакіламетравую адлегласць, даставіў шахцёра ў Маскву.

Некалькі гадоў назад у падобных выпадках памірала дзевяноста чалавек са ста, але Барыс не загіне, таму што на дапамогу прыйшла штучная нырка. Яна часова замяняе функцыі сапраўднай пры вострай і хранічнай нырачнай недастатковасці і атручэннях, пры парушэнні солевага балансу і лячэнні цяжкіх ацёкаў.

У апарата вялікія магчымасці. Ён пазбаўляе арганізм ад лішку вады, уводзіць патрэбныя пажыўныя рэчывы, лякарствы, кісларод.

Штучная нырка створана ў Інстытуце эксперыментальнай хірургічнай медыцынскай апаратуры і інструментаў пад кіраўніцтвам дырэктара інстытута Міхаіла Ананьева. Вядучая роля належыць інжынеру-канструктару Юрыю Казлову. Праводзячы доўгія гадзіны ў клініках, ён стаў удзельнікам многіх аперацый, і яго ўменне кіраваць апаратам часта вырашае лёс хворага.

У лабараторыі інстытута працягваюць удасканальваць апарат, нягледзячы на тое, што савецкая канструкцыя мае многа пераваг у параўнанні з вядомымі зарубежнымі мадэлямі.

На амерыканскай выстаўцы ў Маскве дэманстраваўся апарат «Кольф-Ватчынгер». Для таго, каб ён пачаў дзейнічаць, патрэбна было запоўніць дыялізатар паўтара тысячамі кубічных сантыметраў донарскай крыві. Максімальная колькасць, якая патрабуецца для работы савецкага апарата, — дзвесце кубічных сантыметраў, у сем з палавінай разоў менш. Больш таго, ён можа працаваць і без крыві донара.

Штучная нырка атрымала шырокае распаўсюджанне ў савецкай медыцыне. Не толькі ў Маскве, але і ў Ленінградзе, Кішынёве паспяхова робяць аперацыі з яе дапамогай. За апошнія гады з'явілася шмат людзей, што ўмеюць кіраваць апаратам; стварылася авіяслужба, якая ў найкарацейшы час дастаўляе хворых да ўстановак. Колькасць такіх установак расце.

У спісе лаўрэатаў Ленінскай прэміі 1963 года мы бачылі імёны стваральнікаў апарата «Штучная нырка» Міхаіла Ананьева, Юрыя Казлова, Анатоля Ткачэнкі і іншых.

Элеанора ГАРБУНОВА,
карэспандэнт АДН.

## ДЗЯКУЙ ДОБРЫМ ЛЮДЗЯМ

Вайна прынесла людзям шмат гора. У мяне яна адабрала здароўе. Цяпер я інвалід, часта нават не ўстаю з пасцелі. І таму мяне асабліва кранаюць клопаты і ўвага людзей. Да мяне часта прыязджаюць малады ўрач Плахоцін, медыцынская сястра Ярмак, фельчар хуткай дапамогі Чарнушэвіч, фельчары Уласавец, Шпак, Дудко. Гэта чулыя і спагадлівыя людзі. Бывае так: урач выпіша лякарства, а яго цяжка дастаць. І вось гэтыя добрыя людзі, не лічачыся з часам, аб'едуць увесь горад, але знойдуць лякарства.

Дзякуй вам, дарагія сябры, за клопаты! Яны так падтрымліваюць мяне ў цяжкія дні.

Б. ГУЗОЎСКАЯ

г. Асіповічы.

## ШТО ТАКОЕ ТРЫХАМАНОЗ? ЦІ ВЫЛЕЧВАЕЦЦА ГЭТА ХВАРОБА?

З такімі пытаннямі звярнулася ў рэдакцыю часопіса «Работніца і сялянка» маладая дзяўчына Н.

У жанчын даволі часта сустракаецца захворванне палавой сферы, якое нярэдка называюць «грыбком». Сапраўды, грыбковыя паражэнні похвы (напрыклад, малочніца) існуюць, яны ўзнікаюць ад развіцця розных грыбкоў, часцей за ўсё — плесневага. Але хвароба, якую апісвае Н., — гэта трыхаманоз, які развіваецца ў выніку пранікнення ў палавыя і мачавыя шляхі похвавай трыхаманады.

Жанчына можа заразіцца трыхаманозам пры няўвазе да гігіенічных мер перасцярогі ў час карыстання прыбіральняй ці ваннай. Крыніцай заражэння могуць быць брудная вада, агульная губка, ручнік, бялізна. Часцей за ўсё заражаюцца жанчыны ва ўзросце ад 20 да 35—40 год, якія жывуць палавым жыццём. Мужчына можа перадаваць трыхаманадную інфекцыю здаровай жанчыне, не захворваючы сам. Скрытая інфекцыя ў мужчын, без усякіх праяўленняў захворвання, іншы раз бывае прычынай даўняга захворвання жанчыны. Трыхаманоз сустракаецца і ў дзяўчат, якія не жывуць палавым жыццём.

У выпадку захворвання жанчыну непакояць выдзяленні і сверб.

Лячыць трыхаманоз трэба ў самым пачатку, бо вострыя формы запалення паддаюцца лячэнню лепш, чым хранічныя, запушчаныя. Часам даводзіцца чуць размовы, нібыта трыхаманоз не вылечваецца. Гэта няпраўда. Трэба толькі быць настойлівай і даводзіць лячэнне да канца. Нярэдка пасля першых працэдур, адчуўшы сябе лепш, жанчына спыняе лячэнне. У выніку хвароба аднаўляецца і набывае хранічны характар. У час лячэння неабходна строга выконваць гігіенічныя правілы і парады ўрача, устрымацца ад палавога жыцця.

Калі жанчына не можа штодня наведваць кансультацыю для лячэння, яна можа выкарыстаць новы супрацьзачаткавы сродак «лютэнурын». Гэтыя таблеткі забіваюць не толькі сперматазоідаў, але і трыхаманад. Для лячэння раіцца на працягу дзесяці дзён уводзіць па дзве таблеткі, змочаныя вадой, на ноч у похву, як мага глыбей да шыйкі маткі. (Дзяўчатам гэта рабіць не рэкамендуецца). Безумоўна, і гэтае лячэнне павінна быць пад кантролем урача.

Дарэмна ты, Н., так непакоішся з-за сваёй хваробы. Праўда, у дзяўчат трыхаманоз лячыць цяжэй, але няма ніякага сумнення, што калі ты давядзеш да канца курс лячэння, назначаны табе ўрачамі, то будзеш здаровая.

КАМІНСКАЯ В. Т.,
кандыдат медыцынскіх навук.




# ПРЫГОЖАЯ ПАСТАВА

Кожная жанчына можа мець прыгожую паставу, лёгкую хаду, словам, быць заўсёды прывабнай. Так, кожная, калі будзе сачыць за сабой, за сваімі штодзённымі рухамі. Вы ніколі не задумваліся, ці правільна вы сядзіце, ходзіце, падымаеце і пераносіце розныя рэчы, прычэсваецеся і нават прыбіраеце ў доме або варыце абед? Але ж гэтыя будзённыя рухі аказваюць вялікі ўплыў на наш арганізм. Няправільныя рухі і пастава ў час работы адбіваюцца на здароўі, псуюць фігуру, пазбаўляюць жанчыну яе натуральнай прыгажосці і грацыі. Апрача таго, прывычка да няправільнай паставы цела перашкаджае дзейнасці ўнутраных органаў (сэрца, лёгкіх, кішэчніка і інш.), дрэнна ўплывае на цячэнне цяжарнасці, родаў і пасляродавага перыяду.

Пры жаданні можна выпрацаваць у сабе карысную прывычку — правільна трымацца, лёгка і прыгожа рухацца.

Перш за ўсё навучыцеся правільна стаяць і хадзіць. Калі вы стаіце, то раўнамерна размяркоўвайце цяжар свайго цела на злёгку расстаўленыя ногі. Тулава і галаву трымайце свабодна, не горбіцеся і не нахіляйцеся ўперад або ўбок. Ніколі не прывучайцеся абапірацца толькі на адну нагу. Гэта можа прывесці да скрыўлення пазваночніка. У час хады ўвесь час старайцеся трымацца прама, прычым адводзьце плечы назад, злёгку падцягнуўшы жывот; галаву крыху прыпадымайце; не пагойдвайце корпус у бакі, не рабіце дробных крокаў, часта перабіраючы нагамі, а хадзіце спакойным сярэднім крокам. Памятайце, што натуральная пастава і лёгкая прыгожая хада асабліва падкрэсліваюць рысы жаноцкасці.

Для таго, каб пазбавіцца ад няправільных, непрыгожых, а часам нават шкодных рухаў у быце, мы раім уважліва прагледзець малюнкі, змешчаныя ніжэй.

Апрача таго, мы настойліва раім займацца фіззарадкай, гімнастыкай, катацца на каньках і лыжах, плаваць, гуляць у валейбол, баскетбол ці тэніс. Усё гэта зробіць вашу фігуру падцягнутай, стройнай, а рухі — спрытнымі і прыгожымі.




1. Няправільная пастава таго, хто піша за круглым сталом.

2. Правільная пастава таго, хто піша за чатырохвугольным сталом.

3. Правільная пасадка на крэсле, якое круціцца. Яно зручнае ў хатняй гаспадарцы і для машыністак.

4. Вось як не трэба прасаваць.

5. Добра прасаваць седзячы.

6. Вось як трэба сядзець у час прыгатавання ежы.

7. Так не трэба замешваць цеста.

8. Так прычэсвацца нязручна.

9. Так трэба прычэсвацца.

10. Так не трэба слаць пасцель (вельмі прагнутая паясніца, галава ўцягнута ў плечы).

11. Вось як трэба слаць пасцель.

12. Няправільнае нашэнне гаспадарчай сумкі (скрыўлены пазваночнік, плечавы пояс перакошаны).

13. Так не стаяць (цяжар цела на адной назе, тулава сагнута, таз перакошаны).

14. Так не трэба сядзець за ядой (плечы падняты, спіна сагнута).

15. Вось так трэба сядзець за ядой.

16. Няправільная хада (цэнтр цяжару цела знаходзіцца ззаду, спіна згорблена).

17. Так не трэба садзіцца (вялікі нахіл тулава, таз вельмі адведзен назад).

18. Правільная хада.

19. Так не трэба падымаць цяжар (амаль не выкарыстоўваецца сіла ног, спіна згорблена).

20. Вось як трэба падымаць цяжар.

21. Так не падымаюцца з крэсла (паясніца прагнута, таз адведзен далёка назад).

22. Няправільнае развешванне бялізны (ногі разам, паясніца вельмі выгнутая).




## ПРА ТОЕ, ПРА СЁЕ...

### ЯК ЗАВАРЫЦЬ ЧАЙ

Калі вы хочаце атрымаць сапраўдную асалоду ад чаю, заварвайце яго так: нагрэйце ваду да бурнага кіпення. Апаласніце фарфоравы чайнік варам. Затым засыпце чай: адну чайную лыжку на 2 шклянкі вады. Заліце чай крутым варам на $^1/_3$ чайніка. Пастаўце чайнік на гарачую пліту або на толькі што выключаную электрапліткy і трымайце 3—4 мінуты, не даводзячы да кіпення. Затым здыміце чайнік, накрыйце яго цёплай накрыўкай яшчэ на 2—3 мінуты, пакуль усплыўшыя развараныя чаінкі не апусцяцца на дно. Пасля гэтага чай гатовы. Чай трэба заварваць перад кожным чаяпіццем. Сухі чай захоўвайце ў шкляным слоіку з добра прыцёртай накрыўкай.

Многія любяць смачнае таплёнае малако. Яго лёгка атрымаць, калі закіпеўшае малако адразу выліць у чысты спаласнуты гарачай вадой тэрмас. Праз 6—7 гадзін малако стане ружовае і пахучае, нібы з духоўкі або рускай печы.



# КУЛІНАРЫЯ

### КАПУСНАЯ ЗАПЯКАНКА

Белакачанную капусту нашынкуйце саломкай, складзіце ў сатэйнік невысокім слоем, падліце крыху булёну, дадайце маргарын і, накрыўшы, тушыце да гатоўнасці. Затым усыпце манныя крупы, увесь час пера-



мешваючы масу. Патушыце 5—10 мінут, потым крыху астудзіце (да 40—50°), уліце сырое яйка, пасаліце і добра перамяшайце.

Масу пакладзіце на бляху, змазаную тлушчам і пасыпаную сухарамі. Паверхню капусты выраўняйце і змажце смятанай. Запякайце ў духоўцы, пакуль на паверхні паявіцца цёмна-залацістая скарынка.

На 700 г капусты 100 г манных круп, 1 яйка, 25 г сухароў, 150 г смятаны, 50 г сметанковага маргарыну.

### САКРЭТЫ ДОБРАГА ЦЕСТА

Каб кіслае дрожджавае цеста было пышнае, усе прадукты, якія дадаюцца ў яго, павінны быць даволі цёплымі. Яйкі папярэдне пагрэйце ў цёплай вадзе; малако, муку, каструлю для цеста, бляхі таксама патрымайце спачатку ў цяпле. Але не перагрэйце. Калі, напрыклад, малако або тлушч будуць вельмі гарачыя, то дрожджавыя грыбкі заварацца, страцяць свае ўласцівасці, і цеста сядзе.

Цеста таксама трэба паставіць у цёплае, але не вельмі гарачае месца, інакш яно хутка падыдзе, а потым у печы апусціцца, і пірог або кекс выйдзе плоскі і непрыгожы.

Тэмпература выпечкі спачатку не павінна быць вельмі высокая. У першыя дваццаць мінут ні ў якім разе не адкрывайце дзверцы духоўкі. У канцы выпечкі пракаліце пірог тонкай драўлянай лучынкай. Калі лучынка застаецца сухая — пірог гатовы.

### ПЕЧАНЫЯ ЯБЛЫКІ



З яблыкаў дастаньце сарцавіну, напоўніце іх цукрам і арэхамі, зверху пакладзіце кавалачак масла. Яблыкі пакладзіце ў каструлю, на дне якой павінна быць крыху вады, і пячыце ў духоўцы.

### НАЧЫНКА ДЛЯ ПІРАГОЎ

Пячонку, лёгкае і сэрца (лівер) вазьміце ў аднолькавых частках, старанна прамыйце ў цёплай, а потым у халоднай вадзе. Заліце халоднай вадой і варыце на невялікім агні. Калі лівер добра пракіпіць, дадайце ачышчаны корань пятрушкі або сельдэрэю. Гатовы лівер крыху астудзіце, прапусціце праз мясарубку разам з крута зваранымі яйкам і злёгку абсмажце на патэльні, дадаўшы дробна нашынкаваную падсмажаную цыбулю, накрышанае зяленіва пятрушкі або кропу, чорны перац і соль.

### САЛОДКІ ЧЫРВОНЫ ПЕРАЦ, МАРЫНАВАНЫ ПА-БАЛГАРСКУ

Спячыце ў духоўцы або ў печы свежыя, здаровыя стручкі чырвонага салодкага перцу. Калі на скурцы ўздымуцца пухіркі, выньце з печы, астудзіце, зніміце скурку, дастаньце зярняты і абрэжце хвосцік. Ачышчаныя струкі разрэжце на чатыры палоскі удоўж, складзіце ў пасудзіну і заліце сталовым воцатам, напалавіну разведзеным вадою. Дадайце соль.

Праз паўтары гадзіны выньце перац, складзіце ў шкляны слоік радамі, перасыпаўшы кожны рад пацёртым часнаком. Заліце алеем.

## ПАРАДЫ ГАСПАДЫНІ

### ЯК ПАМЫЦЬ ЗАМАСЛЕНУЮ СПЕЦВОПРАТКУ

Накрышыце чвэрць кавалка гаспадарскага мыла і растварыце яго ў літры вару. Калі раствор крыху астыне, дадайце ў яго ½ літра газы і сталовую лыжку соды для бялізны.

Спяцоўку вытрасіце. Прыгатаваным саставам старанна натрыце спяцоўку, скруціце яе і пакіньце на ноч або на суткі. Потым памыйце ў гарачай мыльнай вадзе, мяняючы ваду два разы, і некалькі разоў прапалашчыце ў цёплай вадзе.

* * *

Жалезныя патэльні мыюць гарачай вадой і праціраюць шчоткай.



* * *

Мясарубкі не трэба сушыць на агні або на пліце. Ад гэтага тупяцца нажы. Мясарубка добра ачышчаецца, калі прапусціць цераз яе чыстую паперу.



* * *

Фарфоравая і крыштальная пасуда мыецца растворам солі (тры сталовыя лыжкі на літр вады). Крыштальную пасуду нельга мыць гарачай вадой. Крышталь ад яе цямнее.



# АЗЕЛЯНІМ СВОЙ ДВОР!

Без зяляніны і кветак нават самая ўдалая планіроўка не робіць сяло ці пасёлак прыгожымі і ўтульнымі.

У гарадах шмат будуюць, але, як правіла, не забываюць пра зялёныя насаджэнні. Ствараюцца новыя паркі, скверы, алеі, бульвары. Сярэдняя плошча зялёных насаджэнняў, якая прыпадае на аднаго жыхара гарадоў і пасёлкаў, перавышае 28 квадратных метраў.

А вось у вёсцы азеляненню аддаецца яшчэ мала ўвагі. Ёсць вельмі многа вёсак, якія пазбаўлены зялёных шчытоў з дрэў і кустоў. Сумна выглядаюць такія паселішчы. У спякотны летні дзень вецер ганяе па вуліцах хмары пылу.

Часта пытаюць: а як азеляніць сядзібу? Колькі трэба раслін? Якіх? Як іх размясціць?

Па знешніх граніцах участка, замест сумнага плота, лепей насадзіць зялёную загарадзь з шыпшыны, грабу, яліны, ліпы і іншых раслін, якія можна час ад часу падстрыгаць. Звычайна для дэкарыравання фасаду жылога будынка і надворных будынкаў шырока скарыстоўваюць павойныя расліны (вінаград, дрэвагубец).

Вялікі дэкаратыўны эфект участку надаюць садовыя дарожкі, нават калі яны проста пасыпаны пяском. Прывабна выглядае таксама і невялікі дэкаратыўны садок, дзе няма спланаваных дарожак, а ўся свабодная плошча засеяна травой.

Лепей за ўсё саджаць на сядзібах і на вуліцах клён, таполю, ясень, дуб, бярозу, ліпу, яліну, сасну, лістоўніцу, чаромху, рабіну, ядловец, бэз, язмін, спірэю. Ну і, вядома, пладова-ягадныя дрэвы і кусты. Для адзіночных пасадак найбольш прыдатны блакітная яліна, плакучая вярба.

На прысядзібны ўчастак плошчай 0,25—0,30 гектара дастаткова 20—30 дэкаратыўных дрэў і столькі ж кустоў, якія прыгожа цвітуць. Для двухрадковай зялёнай загарадзі на 1 пагонны метр высаджваюць 3—5 дрэў ці кустоў.

Найбольш святла патрабуюць кветкі. Таму кветнікам адводзяцца сонечныя адкрытыя месцы. Лепей саджаць шматгадовыя расліны: флоксы, касачы, рамонак, прымулы, ландышы, цюльпаны, нарцысы, падснежнікі, званочкі, незабудкі, гваздзікі, фіялкі.

Але падабраць расліны — гэта толькі палавіна справы. Трэба ўдала размясціць іх на ўчастку.

У нашай рэспубліцы ўстанавілася цудоўная традыцыя — штогод садзіць дрэвы, кусты і кветкі, закладваць фруктовыя сады. Памятайце, сябры: восень — найлепшая пара для зялёных работ.

Людміла КІРЫЛЬЧЫК,
інжынер зялёнага будаўніцтва.

## ДЛЯ ВАС, МУЖЧЫНЫ

### ТАБУРЭТ ДЛЯ ЧЫСТКІ АБУТКУ

Яго можна зрабіць са звычайнага табурэта, укараціўшы ножкі да 35 см. Потым зрабіце моцную скрынку з брускоў і фанеры вышынёй 10 см і прымацуйце зверху да табурэта. У ёй захоўвайце шчоткі, ґуталін. Плоскасць, на якую ставіцца нага, пакрыйце лінолеумам.






* * *

Фіранку для душа вы можаце зрабіць самі.

Да вобада прышыйце цырату або пласцікатны абрус. Пры дапамозе тоўстага шнура павесьце ўсё на крук.

Унутры, уздоўж краёў, прышыйце петлі з гумкі і гузікі, якія будуць зашпільвацца ў час купання. Не забудзьце пра кішэні для мыла і губкі.

---

Дарагая Галя
з Бачэйкава Бешанковіцкага раёна!

Рэдакцыя з радасцю адказала б на тваё пісьмо, але ж ты не паведаміла ні свайго дакладнага адрасу, ні прозвішча. Напішы нам, і мы адкажам табе.

# ГУМАР



Мікалай ПРАЎДЗІН

## МАМАЧКА

Мал. Л. Асецкага.

Жанчына паспешліва падымалася на другі паверх.

— Ток, ток, ток! — звонка выстуквалі яе абцасікі, і гук гэты гулка бегаў па пустых класах, губляючыся дзесьці ў глыбіні школьнага калідора.

Адшукаўшы вачыма дырэктарскі кабінет, жанчына імкліва, без стуку, адчыніла дзверы.

Дырэктар быў не адзін. Побач з ім сядзеў завуч, які штосьці тлумачыў яму.

Не звяртаючы ўвагі на іх занятасць, жанчына падляцела да стала і з ходу атакавала кіраўнікоў школы.

— Хто можа мне растлумачыць, што гэта такое?! Чаму майго сына караюць за самы нязначны ўчынак, а выхоўваць не жадаюць? Ён жа добры хлопчык! Праўда, як і ўсе вельмі здольныя дзеці, ён крыху сваволіць...

— Дазвольце, дазвольце,—сказаў дырэктар.— А як...

— Не, ужо вы дазвольце — абарвала яго жанчына.— Паколькі выклікалі, то дазвольце выказаць усё. Мы з мужам доўга маўчалі. Мы назіралі, як вы займаецеся з дзецьмі... Мы прыглядаліся, чаму вы іх вучыце, якімі метадамі выхоўваеце. Гэта ж ганьба — у наш касмічны час за самую нязначную правіннасць палохаць дзіця выключэннем са школы або выклікам бацькоў. Вы разумееце! Ганьба!

— Дазвольце, грамадзянка...— скарыстаўшы міжвольную паўзу, нарэшце, змог вымавіць слова дырэктар.— Можа і ганьба, але ў чым справа? Я зусім нічога не разумею... Вы, Павел Іванавіч, у курсе падзей?— звярнуўся ён да завуча.

— Не, Іван Міхайлавіч, гэту грамадзянку я бачу ўпершыню.

— Тады можа вы ўсё-такі растлумачыце, у чым справа?— звярнуўся дырэктар да жанчыны.

— Як у чым справа?! — зноў закіпаючы, як самавар, накінулася на дырэктара наведвальніца.— Вы мяне выклікаеце ў школу, патрабуеце аддаваць больш увагі выхаванню сына, а самі нічога не жадаеце рабіць!.. Здымаеце з сябе адказнасць.

— Даруйце, а як ваша прозвішча?— ледзь паспеў уставіць дырэктар.

— Маё?!. У нас з сынам адно прозвішча!

І, выхапіўшы з сумачкі складзены ў чатыры столкі аркуш паперы, жанчына дэманстратыўна кінула яго на стол.

Нахмурыўшыся, дырэктар моўчкі дастаў з бакавой кішэні акуляры, павольна, стрымліваючы сябе, надзеў іх на нос і разгарнуў паперу.

Праз хвіліну па ягоным твары прабегла ўсмешка. Ён працягнуў пісьмо завучу: «Пачытайце, Павел Іванавіч! Цікава!..»

Даўшы магчымасць свайму намесніку пазнаёміцца з дакументам, дырэктар узняў галаву і паглядзеў на расчырванелы ад злосці твар наведвальніцы.

— Так, вы кажаце праўду. Вас сапраўды выклікалі з прычыны дрэнных паводзін вашага сына, вучня восьмага класа... Але толькі сын ваш вучыцца ў другой школе...



«Вы ўжо тры гады абяцаеце нам клуб...»
«Вось бачыце, значыць мы наш пункт гледжання не мяняем».



Без слоў...
Малюнкі З. КАНДЭЛІКА (Чэхаславакія).

На першай старонцы вокладкі — малюнак мастака В. Плаксіна.

На чацвёртай старонцы вокладкі — моды.

1. Дэмісезоннае паліто спартыўнага крою. Каўнер і гузікі скураныя.
2. Зручны касцюм для хлопчыка.
3. Плацце з клятчастай тканіны. Спадніца і кішэні краяцца па касой нітцы.
4—6. Спартыўны касцюм для дзяўчыны. Ён складаецца з жакета, пашытага з гладкай тканіны, і клятчастай спадніцы са шлейкамі. Касцюм дапоўнен клятчастым шалікам.
5. Плацце з тканіны ў крапінку. Ліф — з напускам.

Адказны рэдактар А. П. УС. Рэдакцыйная калегія: М. Н. БАРСТОК, А. С. ВАСІЛЕВІЧ, Т. Ц. ДЗМІТРЫЕВА, М. А. ЖЫДОВІЧ, Р. У. КУДРЭВІЧ, М. М. ТУР, В. І. ФІЛІПАВА, В. А. ЧАРНЯЎСКАЯ.

АТ 03391. Журнал «Работница и крестьянка» на белорусском языке. Издание ЦК КП Белоруссии.

Падп. да друку 2/IX 63 г. Друк. арк. 3. Аўт. арк. 4. Папера 60×90¹/₈. Адрас рэдакцыі: Мінск, Ленінскі праспект, 77.

Тэлефоны: адказн. рэдактара—3-17-51, адказн. сакратара—3-38-14, аддзелаў прамысловасці, сельскай гаспадаркі і культуры—3-38-24.

Друкарня выдавецтва «Звязда», Мінск. Цана 18 кап. Дадатак—выкрайка. Тыраж 195 272. Зак. 451.


74995
МОДЫ
1
2
3
4
5
6